Пролетарыі ўсіх краін, єднайцеся!

ЛІТАРАТУРА І МАСТАЦТВА

ОРГАН ПРАУЛЕННЯ САЮЗА СОВЕЦКІХ ПІСЬМЕННІКАУ БССР І УПРАУЛЕННЯ ПА СПРАВАХ МАСТАЦТВАУ ПРЫ СНК БССР

№ 35 (449) | Серада, 11 кастрычніка 1939 года | Цана 20 кап.

У ВЯЛІКІМ СОВЕЦКІМ САЮЗЕ ПРАЦОЎНЫЯ ЗАХОДНЯЙ БЕЛАРУСІ БАЧАЦЬ СВАЮ СОЦЫЯЛІСТЫЧНУЮ РАДЗІМУ, СВАЮ БАЦЬКАЎШЧЫНУ.

ДА ЎСІХ ЧАСОВЫХ УПРАЎЛЕННЯЎ ГАРАДОЎ ЗАХОДНЯЙ БЕЛАРУСІ

Ад Часовага Упраўлення горада Беластока

ЗВАРОТ

Польская памешчыцка-капіталістычная дзяржава, аснованая на бязлітаснай эксплаатацыі і грабяжы працоўных, на нацыянальным прыгнечанні, аказалася яўна несастаяцельнай, развалілася і фактычна перастала існаваць. Польскі ўрад не здолеў арганізаваць абарону дзяржавы, кінуў народы, якія насяляюць Польшчу, на волю лёсу і, захапіўшы золата, уцёк за граніцу.

Совецкі ўрад палічыў сваім свяшчэнным абавязкам падаць руку дапамогі сваім братам—народам, якія насяляюць Заходнюю Беларусь. Рабоча-Сялянская Чырвоная Армія з чэсцю выканала ўскладзеную на яе комуністычнай партыяй і Совецкім урадам гістарычную задачу. Народы Заходняй Беларусі назаўсёды вызвалены магутнай Рабоча-Сялянскай Чырвонай Арміяй ад эксплаатацыі польскіх памешчыкаў і капіталістаў, ад лютага нацыянальнага гнёту.

Чырвоная Армія абараніла жыццё і маемасць насельніцтва Заходняй Беларусі ад разарэння і знішчэння. Насельніцтва Заходняй Беларусі атрымала цяпер магчымасць зажыць свабодным, радасным, мірным і шчаслівым жыццём. Зараз наступіў час для народаў Заходняй Беларусі сказаць сваё слова аб стварэнні новага дзяржаўнага ўстройства, аб стварэнні ўлады, якая цалкам служыла-б інтарэсам народа і была-б уладаю народа, уладаю працоўных.

Неабходна вызначыць характар будучай улады, каб затым прыступіць і да яе стварэння. Неабходна вырашыць пытанне аб уваходжанні абласцей Заходняй Беларусі ў састаў Беларускай Совецкай Соцыялістычнай Рэспублікі і тым самым у Саюз Совецкіх Соцыялістычных Рэспублік. Тады нічыя захватніцкая рука ніколі не пасмее пасягнуць на нашу мірную працу. Заходняя Беларусь будзе апірацца на магутнасць усяго Вялікага Саюза Совецкіх Соцыялістычных Рэспублік.

Вынесці гэтыя гістарычныя рашэнні можа і павінен аўтарытэтнейшы орган, які выражае карэнныя інтарэсы працоўных, волю і думку народа. Такім органам павінна з'явіцца Народнае Сабранне Заходняй Беларусі. Яно павінна складацца з дэпутатаў, якіх выбярэ і акружыць высокім давер'ем сам народ.

Часовае ўпраўленне гор. Беластока выносіць прапанову склікаць Народнае Сабранне для вырашэння асноўных пытанняў дзяржаўнага ўстройства, бярэ на сябе ініцыятыву стварэння камітэта па арганізацыі выбараў дэпутатаў Народнага Сабрання і запрашае часовыя ўпраўленні гарадоў дэлегіраваць сваіх прадстаўнікоў у ствараемы камітэт па арганізацыі выбараў.

Рабочыя, сяляне і інтэлігенцыя Заходняй Беларусі з поўным адабрэннем сустрэнуць прапанову аб скліканні Народнага Сабрання і акажуць Народнаму Сабранню поўнае і актыўнае падтрыманне ў вырашэнні пытанняў, якія перад ім стаяць.

Насельніцтва Заходняй Беларусі поўна рашучасці, на аснове ленінска-сталінскай нацыянальнай палітыкі, разам з усім совецкім народам, разам з працоўнымі Совецкай Беларусі будаваць новае, светлае, радаснае жыццё пад сонцам Сталінскай Канстытуцыі.

У вялікім Совецкім Саюзе працоўныя Заходняй Беларусі бачаць сваю соцыялістычную радзіму, сваю бацькаўшчыну. На выбары дэпутатаў у Народнае Сабранне рабочыя, сяляне і інтэлігенцыя Заходняй Беларусі пойдуць пад лозунгам устанаўлення на тэрыторыі Заходняй Беларусі Совецкай улады, як улады сапраўды народнай, пад лозунгам уваходжання Заходняй Беларусі ў састаў Беларускай Совецкай Соцыялістычнай Рэспублікі; пад лозунгам адабрэння канфіскацыі памешчыцкіх зямель у карысць сялян, пад лозунгам патрабавання нацыяналізацыі банкаў і буйной прамысловасці.

Гэтыя патрабаванні працоўныя Заходняй Беларусі аднадушна падтрымліваюць і будуць энергічна змагацца за правядзенне іх у жыццё.

Няхай жывуць народы Заходняй Беларусі!

Няхай жыве Народнае Сабранне Заходняй Беларусі!

Няхай жыве Вялікі Саюз Совецкіх Соцыялістычных Рэспублік і яго непераможная Рабоча-Сялянская Чырвоная Армія!

Няхай жыве вялікі друг, настаўнік і правадыр працоўных усяго свету таварыш Сталін!

Часовае ўпраўленне гор. Беластока:

Старшыня В. Б. ГАЙСІН.

Члены: М. І. МАРКЕЕЎ, М. І. ДЗЬЯЧУК, А. Г. МАШЭВІЦКІ.

Гор. Беласток, 5 кастрычніка 1939 года.

ПАСТАНОВА

Камітэта па арганізацыі выбараў у Народнае Сабранне Заходняй Беларусі

Згодна зварота Часовага Упраўлення горада Беластока ад 5 кастрычніка 1939 года — аб выбарах у Беларускае Народнае Сабранне і стварэнні Камітэта для арганізацыі выбараў, падтрыманага шматлікімі сходамі працоўных у гарадах і сёлах Заходняй Беларусі, створан Камітэт па арганізацыі выбараў у Беларускае Народнае Сабранне з прадстаўнікоў часовых упраўленняў гарадоў і прадстаўнікоў рабочых, сялян і працоўнай інтэлігенцыі.

Аб'яўляецца састаў Камітэта:

Тав. Гайсін В. Б. — старшыня Часовага Упраўлення па Беластоцкай вобласці.

Тав. Дзьячук М. І. — працаўніца фабрыкі Эйдэльмана.

Тав. Маркееў М. І. — член Часовага Упраўлення горада Беластока.

Тав. Машэвіцкі А. Г. — член Часовага Упраўлення горада Беластока.

Тав. Спасаў П. С. — старшыня Часовага Упраўлення горада Беластока.

Тав. Шэстак І. Ф. — селянін Стаўбцоўскай воласці Стаўбцоўскага павета Навагрудскай вобласці.

Тав. Ермаковіч П. І. — кацельшчык чыгуначнага дэпо станцыі Баранавічы.

Тав. Клепачка А. П. — член Часовага Упраўлення горада Вільна.

Тав. Нікалаева З. В. — настаўніца горада Брэст-Літоўска.

Тав. Радзішэўскі В. М. — старшыня сялянскага камітэта вёскі Волька Васількоўскай воласці Беластоцкага павета.

Камітэт па арганізацыі выбараў у Беларускае Народнае Сабранне **пастанаўляе:**

1. Назначыць дзень выбараў у Беларускае Народнае Сабранне — нядзелю — 22 кастрычніка 1939 года.
2. Аб'явіць днём пачатка выбарчай кампаніі па выбарах дэпутатаў Беларускага Народнага Сабрання — 7 кастрычніка 1939 года.
3. Зацвердзіць «Парадак арганізацыі выбараў у Беларускае Народнае Сабранне».
4. Выбраць старшынёй Камітэта па арганізацыі выбараў у Беларускае Народнае Сабранне тав. Гайсіна В. Б.; сакратаром Камітэта тав. Дзьячук М. І.
5. Уключыць у састаў Камітэта па арганізацыі выбараў дэлегіраваных Прэзідыумам Вярхоўнага Совета брацкай Беларускай Совецкай Соцыялістычнай Рэспублікі тт. Наталевіча Н. Я., Грэкаву Н. Г., Папкова Л. П.

Старшыня Камітэта па арганізацыі выбараў у Беларускае Народнае Сабранне ГАЙСІН В. Б.

Сакратар Камітэта па арганізацыі выбараў у Беларускае Народнае Сабранне ДЗЬЯЧУК М. І.

г. Беласток, 6 кастрычніка 1939 г.



Плакат, выпускаемы выдавецтвам «Мастацтва», прысвечаны вызваленню працоўных Заходняй Украіны і Заходняй Беларусі ад ярма панскай Польшчы. Работа мастака Рачэўскага.
Фота-кліша ТАСС.

ПАРАДАК АРГАНІЗАЦЫІ ВЫБАРАЎ У НАРОДНАЕ САБРАННЕ ЗАХОДНЯЙ БЕЛАРУСІ

РАЗДЗЕЛ І.
Агульныя палажэнні

1. Выбары дэпутатаў у Народнае Сабранне Заходняй Беларусі праводзяцца выбаршчыкамі на аснове ўсеагульнага, роўнага і прамога выбарчага права пры тайным галасаванні.

2. Выбары дэпутатаў у Беларускае Народнае Сабранне з'яўляюцца ўсеагульнымі: усе грамадзяне Заходняй Беларусі, дасягнуўшыя 18 год, незалежна ад расавай і нацыянальнай прыналежнасці, веравызнання, адукацыйнага цэнза, соцыяльнага паходжання, маемаснага становішча і мінулай дзейнасці, маюць права прымаць удзел у выбарах дэпутатаў і быць выбранымі ў Народнае Сабранне.

3. Выбары дэпутатаў з'яўляюцца роўнымі: кожны грамадзянін мае адзін голас; усе грамадзяне прымаюць удзел у выбарах на роўных падставах.

4. Жанчыны карыстаюцца правам выбіраць і быць выбранымі нароўні з мужчынамі.

5. Выбары дэпутатаў у Беларускае Народнае Сабранне праводзяцца па выбарчых акругах. Кандыдаты пры выбарах у Народнае Сабранне выстаўляюцца па выбарчых акругах.

Кожная выбарчая акруга пасылае ў Беларускае Народнае Сабранне аднаго дэпутата.

РАЗДЗЕЛ II.
Спісы выбаршчыкаў

6. Спісы выбаршчыкаў складаюцца ў гарадах Часовымі Упраўленнямі, а ў сельскіх мясцовасцях — гмінным (валасным) або местачковымі Сялянскімі Камітэтамі.

7. У спісы выбаршчыкаў уключаюцца ўсе грамадзяне, якія пражываюць (пастаянна або часова) к моманту складання спісаў у даным горадзе, мястэчку, сельскім населеным пункце, дасягнуўшыя ка дню выбараў 18 год.

8. Ніхто з выбаршчыкаў не можа быць унесен больш, чым у адзін выбарчы спіс.

9. Спісы выбаршчыкаў складаюцца па кожнаму выбарчаму ўчастку ў алфавітным парадку з указаннем прозвішча, імені, імені па бацьку, узросту і месцажыхарства выбаршчыка і падпісваюцца старшынёй Часовага Упраўлення або Сялянскага Камітэта.

10. Спісы выбаршчыкаў павінны быць складзены не пазней чым за 9 дзён да выбараў.

11. Часовае Упраўленне або Сялянскі Камітэт абавязаны разглядзець кожную скаргу, паданую выбаршчыкам аб няправільнасці ў спісу выбаршчыкаў або неўключэнні ў спіс, у двухдзённы тэрмін.

РАЗДЗЕЛ III.
Выбарчыя акругі па выбарах у Беларускае Народнае Сабранне

12. Выбарчая акруга па выбарах у Народнае Сабранне складаецца па прынцыпу: 5 тысяч насельніцтва на акругу.

13. Утварэнне выбарчых акруг па выбарах у Беларускае Народнае Сабранне праводзіцца Часовымі Упраўленнямі абласцей — Навагрудскай, Віленскай, Беластоцкай і Палескай (тэрыторыя былых ваяводстваў).

14. Спісы выбарчых акруг па выбарах у Народнае Сабранне апублікоўваюцца па абласцях Часовымі Упраўленнямі абласцей не пазней чым за 10 дзён да выбараў.

РАЗДЗЕЛ IV.
Выбарчыя ўчасткі

15. Для прыёму выбарчых бюлетэняў і падліку галасоў тэрыторыя гарадоў, мястэчак і сельскіх населеных пунктаў, якія ўваходзяць у выбарчыя акругі па выбарах у Народнае Сабранне, дзеліцца на выбарчыя ўчасткі.

16. Утварэнне выбарчых участкаў праводзіцца ў гарадах—Часовымі Упраўленнямі, у сельскіх мясцовасцях — Часовымі Упраўленнямі гарадоў сумесна з гміннымі (валаснымі) Сялянскімі Камітэтамі.

17. Утварэнне выбарчых участкаў праводзіцца не пазней чым за 10 дзён да выбараў.

18. Гарады і мястэчкі дзеляцца на выбарчыя ўчасткі з разліку адзін выбарчы ўчастак на 1.000 чалавек насельніцтва.

19. У сельскіх мясцовасцях выбарчыя ўчасткі ўтвараюцца з разліку адзін выбарчы ўчастак на 500 чалавек насельніцтва.

У сельскім населеным пункце, з колькасцю насельніцтва больш 500 чалавек, як правіла, утвараецца адзін выбарчы ўчастак.

У сяленнях або групе сяленняў, з колькасцю насельніцтва менш 500 чалавек, але не ніжэй 100 чалавек, у тых выпадках, калі адлегласць такіх сяленняў да цэнтра выбарчага ўчастка перавышае 10 км., могуць быць утвораны асобныя выбарчыя ўчасткі.

РАЗДЗЕЛ V.
Выбарчыя камісіі

20. У кожнай выбарчай акрузе па выбарах у Беларускае Народнае Сабранне ўтвараецца Акруговая выбарчая камісія.

21. Акруговыя выбарчыя камісіі па выбарах у Беларускае Народнае Сабранне ўтвараюцца Часовымі Упраўленнямі абласцей не пазней чым за 10 дзён да выбараў у саставе старшыні, намесніка старшыні, сакратара і чатырох членаў.

22. Акруговая выбарчая камісія:

а) устанаўлівае парадкавыя нумары выбарчых участкаў;

б) рэгіструе выстаўленых кандыдатаў у дэпутаты Народнага Сабрання;

в) выпускае выбарчыя бюлетэні і забяспечвае імі ўчастковыя выбарчыя камісіі;

г) праводзіць падлік галасоў і ўстанаўлівае рэзультаты выбараў па акрузе;

д) прадстаўляе ў Часовае Упраўленне вобласці справаводства па выбарах;

е) выдае выбранаму дэпутату пасведчанне аб выбранні.

23. У кожным выбарчым участку ствараецца ўчастковая выбарчая камісія.

24. Участковыя выбарчыя камісіі ўтвараюцца ў гарадах — Часовымі Упраўленнямі, у сельскіх мясцовасцях — Часовымі Упраўленнямі сумесна з гміннымі (валаснымі) Сялянскімі Камітэтамі не пазней, чым за 10 дзён да выбараў у саставе старшыні, намесніка старшыні, сакратара і чатырох членаў.

25. Участковая выбарчая камісія:

а) праводзіць па выбарчаму ўчастку прыём выбарчых бюлетэняў;

б) праводзіць падлік галасоў па кожнаму кандыдату ў дэпутаты Народнага Сабрання;

в) перадае справаводства па выбарах у Акруговую выбарчую камісію.

26. Усе пытанні ў выбарчых камісіях вырашаюцца простай большасцю галасоў; пры роўнасці галасоў — голас старшыні дае перавагу.

РАЗДЗЕЛ VI.
Парадак выстаўлення кандыдатаў ў дэпутаты Беларускага Народнага Сабрання

27. Права выстаўлення кандыдатаў у дэпутаты Беларускага Народнага Сабрання забяспечваецца за Сялянскімі Камітэтамі, Часовымі Упраўленнямі, сходамі рабочых па прадпрыемствах, сходамі рабочай гвардыі і сходамі інтэлігенцыі.

28. Не пазней чым за 8 дзён да выбараў усе арганізацыі і сходы, якія выстаўляюць кандыдатаў у дэпутаты Беларускага Народнага Сабрання, абавязаны зарэгістрыраваць кандыдатаў у дэпутаты ў адпаведнай Акруговай выбарчай камісіі.

29. Акруговыя выбарчыя камісіі абавязаны зарэгістрыраваць усіх кандыдатаў у дэпутаты Народнага Сабрання, выстаўленых арганізацыямі і сходамі з захаваннем патрабаванняў гэтага «Парадка арганізацыі выбараў у Народнае Сабранне Заходняй Беларусі».

30. Арганізацыя або сход, якія выстаўляюць кандыдата ў дэпутаты Народнага Сабрання, абавязаны прадставіць у Акруговую выбарчую камісію наступныя дакументы:

а) пратакол схода або пасяджэння, выставіўшага кандыдата ў дэпутаты, падпісаны членамі прэзідыума, з указаннем іх узросту, месца жыхарства, найменавання арганізацыі, выставіўшай кандыдата, указання аб месцы, часе і колькасці ўдзельнікаў схода або пасяджэння, выставіўшага кандыдата ў дэпутаты. Апрача таго ў пратаколе павінны быць указаны прозвішча, імя, імя па бацьку кандыдата ў дэпутаты, яго ўзрост, месца жыхарства, занятак;

б) заяву кандыдата ў дэпутаты аб яго згодзе балаціравацца па данай выбарчай акрузе ад выставіўшай яго арганізацыі або схода.

31. Кандыдат у дэпутаты Народнага Сабрання можа галасавацца толькі ў адной акрузе.

32. Прозвішча, імя, імя па бацьку, узрост, занятак кожнага зарэгістрыраванага кандыдата ў дэпутаты Беларускага Народнага Сабрання і найменаванне арганізацыі або схода, выставіўшага кандыдата, апублікоўваюцца Акруговай выбарчай камісіяй не пазней, чым за 7 дзён да выбараў.

33. Усе зарэгістрыраваныя кандыдаты ў дэпутаты Беларускага Народнага Сабрання падлягаюць абавязковаму ўключэнню ў выбарчы бюлетэнь.

34. Кожнай арганізацыі, выставіўшай кандыдата, зарэгістрыраванага ў Акруговай выбарчай камісіі, таксама як кожнаму грамадзяніну Заходняй Беларусі, забяспечваецца права беспераШкоднай агітацыі за гэтага кандыдата на сходах, у друку і іншымі спосабамі.

РАЗДЗЕЛ VII
Парадак галасавання

35. Выбары ў Беларускае Народнае Сабранне праводзяцца па ўсёй Заходняй Беларусі 22 кастрычніка 1939 года.

36. Штодзенна на працягу апошніх 8 дзён перад выбарамі Участковая выбарчая камісія шырока апавяшчае выбаршчыкаў аб дні выбараў і месцы выбараў.

37. Падача галасоў выбаршчыкамі праводзіцца ў дзень выбараў ад 6 гадзін раніцы да 12 гадзін ночы.

38. У 6 гадзін раніцы ў дзень выбараў старшыня Участковай выбарчай камісіі ў прысутнасці яе членаў правярае выбарчыя скрынкі і наяўнасць складзенага спіса выбаршчыкаў, пасля чаго закрывае на замок скрынкі і запрашае выбаршчыкаў прыступіць да падачы галасоў.

39. Кожны выбаршчык галасуе асабіста, з'яўляючыся для гэтага ў памяшканне для галасавання, прычым падача галасоў выбаршчыкамі праводзіцца шляхам апускання ў выбарчую скрынку выбарчага бюлетэня.

40. У памяшканні для выбараў выдзяляецца для запаўнення бюлетэняў асобы пакой, у якім у часе галасавання забараняецца прысутнасць каго-б то ні было, у тым ліку і членаў Участковай выбарчай камісіі, апрача галасуючых; пры допуску ў пакой для запаўнення бюлетэняў адначасова некалькіх выбаршчыкаў, ён павінен быць абсталяван перагародкамі або шырмамі па ліку дапускаемых адначасова выбаршчыкаў.

41. З'явіўшыся ў выбарчае памяшканне, выбаршчык прад'яўляе сакратару або члену Участковай выбарчай камісіі любы дакумент, які сведчыць яго асобу, і пасля праверкі па спісу выбаршчыкаў і адзнакі ў спісу выбаршчыкаў атрымлівае выбарчы бюлетэнь устаноўленага ўзору.

42. Выбаршчык у пакоі, адведзеным для запаўнення выбарчых бюлетэняў, пакідае ў выбарчым бюлетэні прозвішча таго кандыдата, за якога ён галасуе, выкрэсліваючы астатніх; пасля гэтага выбаршчык пераходзіць у пакой, дзе змяшчаецца Участковая выбарчая камісія, і апускае выбарчы бюлетэнь у складзеным выглядзе ў выбарчую скрынку.

43. Выбаршчыкі, якія не маюць магчымасці з прычыны непісьменнасці або якога-небудзь фізічнага недахопу самастойна запоўніць выбарчы бюлетэнь, маюць права запрасіць у пакой, дзе запаўняюцца выбарчыя бюлетэні, любога іншага выбаршчыка для запаўнення выбарчага бюлетэня.

44. Адказнасць за парадак у выбарчым памяшканні нясе старшыня камісіі, і яго распараджэнні для ўсіх прысутных абавязковы.

45. У 12 гадзін ночы дня выбараў старшыня Участковай выбарчай камісіі аб'яўляе падачу галасоў закончанай, і камісія прыступае да ўскрыцця выбарчых скрынак.

РАЗДЗЕЛ VIII
Вызначэнне рэзультатаў выбараў

46. Участковая выбарчая камісія, ускрыўшы скрынкі, звярае лік паданых бюлетэняў з лікам асоб, прымаўшых удзел у галасаванні (на аснове адзнак у спісу выбаршчыкаў пры атрыманні бюлетэняў), і рэзультаты зверкі заносіць у пратакол.

47. Старшыня Участковай выбарчай камісіі аглашае ў прысутнасці ўсіх членаў Участковай выбарчай камісіі рэзультаты галасавання па кожнаму бюлетэню.

48. Прызнаюцца несапраўднымі бюлетэні, у якіх пры галасаванні пакінута больш аднаго кандыдата, а таксама бюлетэні неўстаноўленага ўзору і колеру.

49. Пры ўзнікненні сумненняў у сапраўднасці выбарчага бюлетэня пытанне вырашаецца Участковай выбарчай камісіяй шляхам галасавання, што адзначаецца ў пратаколе.

50. Участковая выбарчая камісія складае па ўстаноўленай форме пратакол галасавання ў адным экземпляры, які падпісваецца ўсімі членамі Участковай выбарчай камісіі, у тым ліку абавязкова старшынёй і сакратаром.

51. Пасля заканчэння падліку галасоў і складання пратакола старшыня камісіі зачытвае пратакол галасавання ў прысутнасці ўсіх членаў камісіі.

52. Пратакол галасавання, складзены Участковай выбарчай камісіяй, неадкладна накіроўваецца ў Акруговую выбарчую камісію з нарочным.

53. Усе выбарчыя бюлетэні (асобна сапраўдныя і асобна прызнаныя несапраўднымі) павінны быць упакаваны Участковай выбарчай камісіяй і разам з пратаколам галасавання накіраваны ў Акруговую выбарчую камісію.

54 Акруговая выбарчая камісія па выбарах Беларускага Народнага Сабрання праводзіць падлік галасоў на аснове пратаколаў, прадстаўленых Участковымі выбарчымі камісіямі.

55. Акруговая выбарчая камісія складае па ўстаноўленай форме пратакол галасавання ў 2-х экземплярах, якія падпісваюцца ўсімі членамі Акруговай выбарчай камісіі, у тым ліку абавязкова старшынёй і сакратаром.

56. Адзін экземпляр пратакола галасавання Акруговая выбарчая камісія неадкладна накіроўвае ў Камітэт па арганізацыі выбараў у Беларускае Народнае Сабранне з нарочным; другі экземпляр пратакола галасавання, разам з справаводствам Акруговай камісіі і выбарчымі бюлетэнямі, атрыманымі ад Участковых выбарчых камісій, здае ў Часовае Упраўленне вобласці.

57. Кандыдат у дэпутаты Народнага Сабрання, які атрымаў абсалютную большасць галасоў, г. зн. больш палавіны ўсіх галасоў, паданых па акрузе і прызнаных сапраўднымі, лічыцца выбраным.

58. Пасля падпісання пратакола старшыня Акруговай выбарчай камісіі аглашае рэзультаты выбараў па акрузе і выдае выбранаму кандыдату ў дэпутаты Беларускага Народнага Сабрання пасведчанне па ўстаноўленай форме аб яго выбранні.


59. Калі ні адзін з кандыдатаў не атрымаў абсалютнай большасці галасоў, а таксама, калі паданая колькасць галасоў па акрузе складае менш палавіны выбаршчыкаў, якія маюць права галасаваць па данай акрузе, Акруговая выбарчая камісія адзначае аб гэтым асобна ў пратаколе, неадкладна паведамляе Часоваму Упраўленню вобласці і з дазволу Часовага Упраўлення вобласці назначае новыя выбары, не пазней чым у 2-дзённы тэрмін пасля першых выбараў.

60. Усякі, хто шляхам насілля, абману, пагроз або подкупу будзе перашкаджаць грамадзяніну Заходняй Беларусі ў ажыццяўленні яго права выбіраць і быць выбраным у Беларускае Народнае Сабранне, — караецца пазбаўленнем волі тэрмінам да двух год.

Старшыня Камітэта па арганізацыі выбараў у Народнае Сабранне Заходняй Беларусі **В. Б. ГАЙСІН.**

Сакратар Камітэта па арганізацыі выбараў у Народнае Сабранне Заходняй Беларусі **М. І. ДЗЬЯЧУК.**

6 кастрычніка 1939 г.
г. Беласток.



Па гарадах Заходняй Беларусі. Від з боку ракі Нёман на горад Гродна.
Фота-кліша ТАСС

1814 г. М. Ю. Лермантаў 1939 г.

ВЯЛІКІ НАРОДНЫ ПАЭТ

15-га кастрычніка мінае 125 год з дня нараджэння вялікага пісьменніка зямлі рускай, геніяльнага паэта Міхаіла Юр'евіча Лермантава.

Дваццаці сямі год ад нараджэння Лермантаў загінуў ад кулі, пасланай у яго «ледзяным, бязлітасным светам». І гэта трагічная смерць паэта ў навальніцу, ля падножжа грознага Машука з'явілася развязкай доўгай і няроўнай барацьбы, якую вёў Лермантаў з свінцова-змрочным светам праклятай расійскай імперыі. Так загінуў і Пушкін, сыходзячы крывёю ў абступіўшай яго ільдзяной пустэчы. Так паміралі паэты. Лермантава загубіла «царства імглы і свавolля, маўклівага замірання, пагібелі без весткі, пакут з хуткай у роце» (Герцэн).

«Лермантаў,—пісаў Дабралюбаў,—здолеўшы рана пасцігнуць недахопы сучаснага грамадства, умеў зразумець і тое, што выратаванне ад гэтага ложнага шляху знаходзіцца толькі ў народзе. Доказам служыць яго дзіўны верш «Радзіма», у якім ён становіцца рашуча вышэй усіх прадрассудкаў патрыятызма і разумее любоў да бацькаўшчыны ісціна, свята і разумна...» Лермантаў добра разумеў, што радзіма ў афіцыяльным яе найменні нічога агульнага не мела да жывой безупыннай гісторыі свайго народа, да радзімы ў яе сапраўдным, свяшчэнным сэнсе. І вось, бязмерна любячы свой народ, сваю вялікую краіну, яе шматвяковую і, у вышэйшай ступені, паэтычную гісторыю, Лермантаў да канца дзён сваіх непрымірыма адносіўся да афіцыяльнай «бацькаўшчыны», да вышэйшых кіруючых колаў, да «нямытай Расіі».

Ратуючыся ад свецкай пецярбургскай чэрні, ад яе «всевидящего глаза», ад яе «всеслышащих ушей», Лермантаў імкнуўся захаваць у цэласці сваю непаўторную чалавечую індывідуальнасць. І гордае замыканне ў самім сабе з'яўляецца толькі сродкам захаваць сябе для народа, для будучага, для благароднейшых пачуццяў і помыслаў. У гордым індывідуалізме паэта не было нічога эгаістычнага. Уся паэзія Лермантава дыхае пафасам уніжанай чалавечнасці, мужнай журботнай мыслі...

«Народжаныя ў гады глухія» людзі таго пакалення, да якіх належаў і Лермантаў, складалі пераходны этап ад пакалення дваранскіх рэвалюцыянераў-дзекабрыстаў да наступных шарэнгаў дэмакратычных рэвалюцыянераў. Ідэйнае развіццё Лермантава праходзіла пад непасрэдным уплывам перадавых грамадскіх пазіцый, пад уплывам ідэй дзекабрызма. Палітычны пратэст адчуваецца ва ўсіх вершах Лермантава. І не дзіўна, што ў сваіх агульных поглядах на задачы і мэты паэзіі Лермантаў працягваў традыцыю Радзішчава, Рылеева, пушкінскай палітычнай лірыкі. Нібы даючы клятву над кінжалам загінуўшага байца, Лермантаў пісаў свае мужныя радкі:

> Да, я не изменюсь и буду тверд душой,
> Как ты, как ты, мой друг железный.

Уся паэзія Лермантава дыхае жаданнем актыўнай справы на карысць свайго народа. «Так жыць нудна, калі няма змагання»,—пісаў Лермантаў. Гнеўнымі радкамі паэт заклеймаваў бяздзейнасць, пасіўнасць свайго пакалення, жывучага «памылкамі бацькоў і позним іх розумам». Страснае жаданне рэвалюцыйнай буры, якая-б спапяліла нікчэмны і прадажны свет, адчуваецца ў шэдэўры палітычнай лірыкі Лермантава, у славутым вершы «На смерть поэта». І ў выдатнай прозе паэта—у «Героі нашага часу» — гучыць тая-ж абвінавачвальная нота па адрасу тых, хто страціў грамадзянскую мужнасць, хто замкнуўся ў чэрствай пагардзе да лёсу свайго народа, да жыцця сваёй краіны.

Немагчыма пераацаніць значэнне лермантаўскай прозы ў развіцці рускай літаратуры. Пазнаёміўшыся з прозай Лермантава, Гогаль пісаў: «У Лермантаве рыхтаваўся будучы вялікі жывапісец рускага быту». Чэхаў лічыў «Тамань» узорам мастацкай «благоуханной прозы».

Лермантаў любіў і ведаў рускую народную паэзію. У «Песні пра купца Калашнікава» Лермантаў з велізарнай творчай пранікнёнасцю, непараўнальнай пластычнай сілай аднавіў настрой і дух рускай народнай паэзіі. Патрыятызм Лермантава ўключаў у сябе і пачцівыя адносіны да ўсіх народаў, змагаючыхся за сваю свабоду і шчасце. Так паэт апяваў вызваленчую барацьбу каўказскіх горцаў. І сёння ўсе вызваленыя народы нашай сацыялістычнай радзімы з любоўю і ўдзячнасцю вымаўляюць імя паэта, чыя «скорбная праца» ў змроку абступіўшага яго жыцця не загінула дарма і дала свае рэальныя плады ўжо ў другім стагоддзі, у другім і аднсўленым жыцці.

Лермантава чытаюць на сваіх мовах многія народы СССР. У радзе культурных свят, якія святкуюцца нашай краінай, услед за Руставелі, Пушкіным, Шэўчэнка, «Давідам Сасунскім» наступае свята Лермантава. Так скрозь вякі пераклікаюцца гіганты, і сярод іх просты, знаёмы, у абліччы апальнага, разжалаванага гусара — любімы і мяцежны Лермантаў.

М. Ю. Лермантаў

ДЭМАН

Усходняя легенда

I.

Журботны Дэман, дух выгнання
Блукаў над грэшнаю зямлёй,
І дум аб светлым яго ранні
Над ім снаваўся тлумны рой.
Аб днях, калі ў харомах света
Ён жыў, шчаслівы херувім,
Калі вандроўніца — камета
З усмешкай яснаю прывета
Любіла памяняцца з ім;
Калі праз вечныя туманы
Ён, веды прагнучы, сачыў,
Як ходзяць зорак караваны,
У багнах неба плывучы;
Калі ён верыў і любіў,
Шчаслівы першы сын тварэння,
Не ведаў злобы і сумнення,
І не пужаў душу яго
Вякоў бясплодных рад панылы,
І многа-многа, ды ўсяго
І ўспомніць не было ў ім сілы.

II.

Даўно забыты, ён блукаў
У пустках света без прыпыну,
І век за векам працякаў,
Як за хвілінаю хвіліна
Маркотнай, роўнай чарадой.
Уладу меўшы над зямлёй,
Ён сеяў зло без асалоды
І злу спрадвечнаму свайму
Не сустракаў ён перашкоды,
І зло дакучыла яму.

III.

І над грамадай гор Каўказа
Выгнаннік рая праляцеў.
Над ім Казбек ярчэй алмаза
Снягамі вечнымі блішчаў,
Глыбока чорнаю разорай,
Дзе нібы змей рассунуў горы,
Дар'ял заломісты ляжаў.
Унізе Церак белагрывы,
Як львіца, скачучы між скал,
Грымеў, і горны звер пужлівы
І птушка, летучы ў прагал,
У гоман вод яго ўнікалі,
І хмар шаўковых талака
З краін паўднёвых здаляка
Яго на поўнач праважалі;
І скалы пільнай чарадой,
Таемнай поўныя дрымоты,
Стаялі моўчкі над вадой
І хваль яе сачылі ўзлёты,
І вежы замкаў тут і там
Глядзелі грозна праз туманы,
Нібы каля каўказскіх брам
Іх вартавыя веліканы.
І дзікі і дзіўны вакруг
Быў божы свет, ды горды дух
Зняважлівым акінуў вокам
Тварэнне бога-ўладара,
І на чале яго высокім
Ні цені злобы, ні дабра.

IV.

І перад ім у падарожжы
Малюнкі іншыя ляглі:
Даліны Грузіі прыгожай
Красой жывою расцвілі.
Шчаслівы, пышны край зямлі!
Старыя, стромкія руіны,
У звонкім бегу ручаі
Па дне з каменчыкаў усякіх,
І купкі роз, дзе салаўі
Красуняў славяць, абыякіх
На вабны голас іх любві;
Чынар густыя сутарэнні
Пад іх ліственным шалашом;
Пячоры, дзе гарачым днём
Знаходзяць сховы сабе алені,
І блеск, і пых, і тлум ліспя,
І гоман радасці жыцця
І пахі кветак і праменняў,
І поўдня палкі, млявы жар,
І араматных розаў дар,
Што вільгаць шлюць у прахладзь ночы,
І зоры яркія, як вочы
Грузінкі юнай, поўнай чар.
Ды апроч зайздрасці халоднай
Не абудзіў прыроды шум
У душы выгнанніка бясплоднай
Ні новых сіл, ні новых дум.
І ўсё, што прад сабой ён бачыў,
Адной знявагаю адзначыў.

V.

Высокі дом, шырокі двор
Пабудаваў князь, Гудал сівы.
Ён каштаваў шмат слёз і сілы
Рабам, паслушным з даўніх пор.
На светлы схіл суседніх гор
Ад сцен яго кладуцца цені,
У скале выбіты ступені.
Яны ад вежы рагавой
Вядуць на рэчку. А на сходах
Пад лёгкай белаю чадрой
Князёўна юная па ваду
У Арагву ходзіць пад гарой.

VI.

Заўжды маўкліва на даліны
Глядзеў з гары пануры дом.
Ды сёння ў ім і шум і гром.
Гучыць зурна, і льюцца віны.
Сасватаў князь дачку сваю.
На баль заклікаў ён радню.
На стрэсе, высланай каўрамі,
Сядзіць нявеста, а вакруг
Гульня і спеў яе падруг.
Ужо далёкімі гарамі
Закрыўся сонейка паўкруг.
У ладкі такты адбівае
Дзявочы тлум, і бубен свой
Бярэ нявеста маладая.
І вось яна адной рукой
Кружыць яго над галавой.
То наймчыцца лягчэй птушкі,
То раптам спыніцца, глядзіць.
І вольгкі зрок яе блішчыць
З-пад гожай вейкавае дужкі;
То чорнай броўкай павядзе,
То раптам нахінецца трошкі,
І па каўры плыве — ідзе
Яе чаруючая ножка.
І пасміхаецца яна,
Дзяцінай радасці паўна.
І месяц, што з-за хмар застрэшкі
Зірне, гуляючы з вадой,
Не параўнаецца з усмешкай,
Як маладосць сама жывой.

VII.

Клянуся зоркамі стожар
Праменняў сонечных патокам,
Багатай Персіі ўладар
І ні адзін у свеце цар
Не цалаваў такога вока.
Гарэма іскрысты фантан
Ні разу душнаю парой
Сваёю срэбранай расой
Не абмываў падобны стан.
Яшчэ нідзе рука людская
Такой галоўкі не ласкала
І кос такіх не расплятала
З тых дзён, як свет пазбаўлен рая.
Клянуся зноў — краса такая
Пад сонцам поўдня не цвіла.

(Працяг будзе).

Пераклаў з рускай мовы ЯКУБ КОЛАС.



ЛЯ ПОМНІКА

Ад горада вяла полем сцяжынка. Мы ішлі, прыпамінаючы сцэну з «Княжны Мэры». «Я люблю скакаць на гарачым кані па высокай траве супроць пустыннага ветру; з прагнасцю глытаю пахкае паветра і накіроўваю погляды ў сінюю далечыню, стараючыся ўлавіць туманныя абрысы прадметаў, якія штомінутна робяцца ўсё ясней і ясней».

Так, ён тут ездзіў на сваім ліхім Чэркесе, ён тут па гэтай сцяжынцы любіў заўсёды гуляць, або па-дзіцячаму імкнецца ўзбірацца на Машук.

Сустрэчны чалавек у чэркесцы мне паказаў дарогу. Вось і паляна. Яна маленькая, хутчэй гэта не паляна, а прыгожы кветнік. Наўкол хвойныя, букавыя і грабавыя лясы. Яны былі жывымі сведкамі пагібелі паэта. Сюды ўвечары 15 ліпеня 1841 года прыйшоў малады паручык Лермантаў з секундантамі.

Тут, на паляне, —

> Его убийца хладнокровно
> Навел удар... Спасенья нет:
> Пустое сердце бьется ровно,
> В руке не дрогнул пистолет.

Прайшло 37 год... На месцы дуэлі пяцігорскі фатограф Энгель паставіў першы помнік — невялікі і просты камень. У 1881 годзе тут была пастаўлена піраміда. І толькі ў 1914 годзе, у стагоддзе юбілей паэта, сабралі грошы і заказалі сапраўдны помнік. Помнік зрабіў з кіславодскага пясчаніка скульптар Мекешын.

Глядзіш на высокі абеліск, на бюст у нішы абеліска і ў думках паўстае жывы паэт. Абеліск абнесен жалезнымі ланцугамі, прымацаванымі да каменных слупоў у выглядзе чатырохкутніка. На слупу кожнага вугла сядзіць каменны грыф. Ён не збіраецца паляцець, а моўчкі вартуе спакой паэта. Зялёная каўказская ель расце ў кожным куту, а ля п'едэстала чырвоненькія кветкі блішчаць пад сонцам. І нейкае хваляванне абымае сэрца.

А воддаль Бештау ахуталася срабрыстым воблакам і кідае погляды на паляну. Ці глядзеў паэт на гэтыя срабрыстыя хмары? Аб чым шумеў тады магутны лес? Што спяваў яму залётны вецер? І кветкі, чырвоныя кветкі, як пырскі гарачай крыві з параненых грудзей!

На абеліску мемарыяльная дошка. На ёй адзначан дзень і гадзіна дуэлі. Але там не адзначана, як у агоніі змагаўся паэт са смерцю, як лілася кроў з грудзей, як прагнуў ён жыць, працаваць. Ён любіў народ, сваю радзіму, любіў —

> Степей холодное молчанье,
> Ее лесов безбрежных колыханье,
> Разливы рек ее, подобные морям...
> ... Дрожащие огни печальных деревень.

І раптам абарвалася жыццё, абарвалася песня на поўслове. У сем гадзін паэта не стала ў жывых. Пад дажджом яго цела праляжала да позняй ночы. Ніхто не ведаў пра лёс паэта. У Пяцігорску нават рамізніка не знайшлося, каб прывезці труп. І толькі каля 11 гадзін нехта Кузьма Чухнін, па просьбе секундантаў, прывёз нябожчыка ў горад.

Тут, на Каўказе, горскія народы любілі паэта. Яны ўвекавечылі яго памяць па-свойму. Яны назвалі ўсё чыстае і светлае імем паэта: крыніцу, якая нясе празрыста-крыштальныя воды Кіславодска; прыгожую станцыю непадалёк ад Пяцігорска, і нарэшце, гару, на якой любіў гуляць Міхаіл Юр'евіч.

ПАВЕЛ ЛЕВАНОВІЧ.

Пяцігорск, 1939 г.

М. Ю. ЛЕРМАНТАЎ

К***

Расцусту досыць выбачаць!
Няўжо злачынцам шчыт парфіра?
Хай дурні іх багатвараць,
Хай ім гучыць другая ліра;
Але спыніся ты пявец,
Златы вянец не твой вянец.

Выгнаннем з стараны сваёй
Хваліся ўсюды, як свабодай;
Высокай думкай і душой
Адоран рана ты прыродай.
Ты бачыў зло, і перад злом
Ты гордым не панік чалом.

Ты пеў аб вольнасці, калі
Тыран грымеў, суды, астрогі;
Баязні чужды на зямлі
І толькі баючыся бога,
Спяваў і ёсць адзін ў краю —
Хто песню зразумеў тваю.

Пераклаў А. УШАКОЎ.

Праф. М. К. Дабрынін

Паэт—змагар

> Нет, я не Байрон, я другой,
> Еще неведомый избранник,
> Как он гонимый миром странник,
> Но только с русскою душой.
> М. ЛЕРМАНТАЎ.

I.

«Гарматы на Сенацкай плошчы разбудзілі цэлае пакаленне»,—пісаў А. І. Герцэн. Да гэтага пакалення належаў і М. Ю. Лермантаў. Калі было паўстанне дзекабрыстаў, Лермантаву было 11 год, Герцэну 13, Белінскаму 14, Огарэву 12, значыць, увесь працэс фарміравання іх праходзіў у абстаноўцы суровай паслясненжаньскай рэакцыі, у эпоху «моравай паласы». Усе свае намаганні Нікалай І накіроўваў да таго, каб утрымаць распад феадальна-дваранскай сістэмы. Гэтым вызначалася яго знешняя і ўнутраная палітыка. Людзі старэйшага пакалення—Пушкін, Чаадаеў і інш. цяжка перажывалі гэты час, моладзь фарміравалася ва ўмовах грамадскай і ўрадавай рэакцыі. Аднак, традыцыі дзекабрызма не памёрлі. Лепшыя прадстаўнікі моладзі марылі аб тым, каб аднавіць саюз па ўзору дзекабрыстаў. Пошукі і мары моладзі сутыкаліся з рэальнай рачаіснасцю вельмі цяжкой і грознай сістэмай нікалаеўскай рэакцыі. Адсюль супярэчнасці, крушэнне ідэалаў, пошукі выйсця, сумненні, шуканні. Напружана працавала мысль, пераважаючай рысай жыцця стаў аналіз. Гэта было, па выразу Белінскага, пераходнае становішча духа, калі старое разбурана, а новае яшчэ не створана...

М. Ю. Лермантаў не прымаў удзелу ў гуртках моладзі, ён ішоў асобным шляхам, але пытанні, якія хвалявалі моладзь, былі яго пытаннямі. У гэтым сэнсе яго паэзія з'яўляецца паэтычнай споведдзю рускага інтэлігента 30—40 год. Іменна ў яго творчасці з найвялікшай паўнатой выражаны ўсе спецыфічныя асаблівасці эпохі: шуканні, сумненні, барацьба, расчараванні, страснае жаданне нэвага і немагчымасць яго дасягнення і г. д. і г. д. Супастаўляючы гісторыю развіцця Лермантава з развіццём Герцэна, Огарава, Белінскага, з гісторыяй развіцця яго пакалення, мы бачым шмат агульнага, але шлях паэта своеасаблівы і адзіноны. Скажам больш: асаблівасці натуры і выхавання Лермантава абумовілі гэту замкнутасць і адзіноцтва Лермантава, але жыццё паставіла перад ім тыя-ж пытанні і вызначыла той-жа характар іх вырашэння. Праўда, ён не марыў аб тым, каб «пачаць у Расіі новы саюз па ўзору дзекабрыстаў», але чула адчуваў у дзекабрызме штосьці роднае і блізкае. Гэта таму, што ён быў сынам сваёй эпохі, геніяльным, з страсным тэмпераментам, вялікай воляй і прагай жыцця, з любоўю да радзімы, да народа. Сучаснае, па трапнаму выразу Белінскага, «жыло ў кожнай кроплі крыві, трапятала з кожным біццём пульса, з кожным уздыхам грудзей».

II.

> Кто может, океан угрюмый,
> Твои изведать тайны? Кто
> Толпе мои расскажет думы?
> Я — или бог — или никто!

Лермантаў быў лепшым выразнікам эпохі 30-х гадоў у паэзіі. Уся разнастайнасць матываў, ідэй, настрояў, узлётаў і падзенняў, расчараванняў і пафасу, уся супярэчнасць у яго лірыцы, прозе і драме народжана, вырасла і самым арганічным чынам звязана з яго пакаленнем, з яго часам, з яго эпохай.

Традыцыі дзекабрызма і рэвалюцыйнае бражэнне 30-х год ярка выражаны ў паэзіі Лермантава. Рэвалюцыйныя матывы ў яго паэзіі загучалі з самага пачатку і не спыняліся да смерці. У 1830 годзе паэт напісаў рад твораў, якія па матывах збліжаюцца з паэзіяй дзекабрызма. У ранняй аповесці «Последний сын вольности» распрацован матыў вольнасці, барацьбы ноўгародскага правадыра Вадзіма супроць прыгнятальніка Рурыка. Вадзім загінуў як змагар супроць тыраніі і дэспатызма.

> Вадим на землю тихо пал,
> Не посмотрел, не простонал—
> Он пал в крови, и пал один
> Последний вольный славянин!

Звяртаючыся на Захад да рэвалюцыі 1830 года, Лермантаў піша вершы «10 июля» і «30 июля», дзе пагражае царам земным судом. У драмах «Люди и страсти», «Странный человек» паэт выступае супроць прыгоннага права з глыбока гуманістычнымі матывамі ў абарону мужыка. У няскончанай аповесці «Вадим» (1832 год) паэт уздымае пытанне аб адносінах да паўстання Пугачова. Герой аповесці Вадзім з'яўляецца адным з важакоў паўстання Пугачова. Тут шмат карцін, дзе выступае адкрытае спачуванне мужыкам. Вось карціна ў царкве, ля нерукатворнага вобраза спасіцеля. «Аднойчы паня і сялянка з грудным дзіцём на руках падыйшлі разам; але першая з пагардным выглядам адштурхнула апошнюю,—і ўшыбленае дзіцё голасна закрычала; не дзіўна, што заўтра, падумаў Вадзім, гэтая багатая жанчына будзе здыхаць на шыбеніцы, тады як бедная, ляскаючы ў далоні, стане паказваць на яе дзецям сваім...» Рэалістычныя замалёўкі Лермантава здзіўляюча правільна і глыбока ахоплівалі сутнасць супярэчнасцей паміж рабамі і панамі, паміж багатымі і беднымі, паміж моцнымі і слабымі. Можна здзіўляцца гэтай спеласці і ўзлётам мыслі і пачуцця. У «Предсказании» паэт дае намёк на народны бунт.

> Настанет год, России черный год,
> Когда царей корона упадет.

Матывы паўстання, адмаўлення, рэвалюцыйнай барацьбы супроць рэчаіснасці, грамадскай сістэмы, вышэйшага свету, дэспатызма і прыгнечання ідуць беспераптыннай ніццю у творчасці Лермантава: «Парус» (1832), «На смерть поэта» (1837), «Тучки» (1840), «1-е января» (1840), «Пророк» (1841), «Родина» (1841), «Прощай немытая Россия» (1841). Асабліва паэт абрушваецца на свет, на яго пустату і пошласць.

> О, как мне хочется смутить веселость их,
> И дерзко бросить им в глаза железный
> стих,
> Облитый горечью и злостью!..

І, нарэшце, як-бы завяршаючы рэвалюцыйныя пратэстуючыя матывы аб лірыцы Лермантава, гучаць яго вершы:

> Прощай немытая Россия,
> Страна рабов, страна господ,
> И вы, мундиры голубые,
> И ты, послушный им народ.

У вершах падобнага роду Лермантаў выступае як паэт-грамадзянін, як прарок, мысліцель, суддзя грамадства. З асаблівай яснасцю сказваецца тут тое, што Лермантаў—паэт бязлітаснай мыслі, мыслі аналізіруючай, мяцежнай, пратэстуючай, паэт волі, паэт-змагар, а не сузіральнік.

III.

Побач з разгледжанымі матывамі ў творчасці Лермантава гучаць і іншыя. У вялікіх паэмах Лермантава 1835—37 гадоў да пратэста прымешваецца сумненне, выступае супярэчнасць. «Боярин Орша», «Песня про купца Калашникова», «Мцыри», «Герой нашего времени», «Демон» — выдатна раскрываюць новы цыкл матываў у творчасці мастака. У першых трох творах паэт звяртаецца ў мінулае таму, што ён незадаволены сучаснай рэчаіснасцю і адышоў ад яе, каб там шукаць жыцця, якога ён не бачыць у сучасным. Героі яго поўныя сіл, жадання барацьбы, але яны асуджаны на гібель. Іх пратэст і адмаўленне ўскладнены сумненнем і бесперспектыўнасцю. Такі Арсеній з «Боярина Орши», такі Сцяпан Парамонавіч з «Песни про купца Калашникова», такі Мцыры.

Мцыры асуджан, выйсця няма, пратэст і барацьба за свабоду не маюць перспектыў і безнадзейны. Але асабліва войстрыя формы набывае такая супярэчнасць у вобразе Пячорына з рамана «Герой нашего времени». Самай істотнай рысай Пячорына з'яўляецца адмаўленне акружаючага свету і барацьба за асобу, за свабоду. Але барацьба і адмаўленне не напаўняюць зместам яго жыццё, у яго няма перспектыў, будучага і ўсё гэта прыводзіць да разладу з грамадствам, да адзіноцтва, да песімізма, да ўнутранай раздвоенасці.

Увесь гэты комплекс супярэчнасцей можа быць сфармуліраван так: ён валодае неабдымнымі сіламі і не ўмее іх рэалізаваць, адчувае высокае назначэнне і не можа адгадаць яго, ён згубіў густ да жыцця і жыве з цікаўнасці, стаіць вышэй асяроддзя і пратэстуе супроць яго, жыве ў разладзе з сабой і грамадствам, жыве з халодным адчаем у грудзях... Пячорын — новы этап у развіцці літаратуры, ён прадаўжае тое, што дадзена ў вобразе Онегіна, ён — Онегін «нашага часу». Не менш глыбока «пераходнае становішча духа» выражана ў паэме «Демон».

Адмаўленне, бязмежнае пазнанне, гордасць, адзіноцтва, безнадзейнасць, песімізм, разрыў з акружаючым, бесперспектыўнасць у будучым — вось комплекс мысляй і пачуццяў, якія раскрыты ў паэме «Демон». Не гледзячы на свае абсалютныя ўласцівасці, горды дух не ў сілах вырашыць праблему асабістага шчасця, знайсці сэнс свайго існавання. Любоў да Тамары не вырашыла супярэчнасці.

> И проклял Демон побежденный
> Мечты безумные свои,
> И вновь остался он надменный,
> Один, как прежде, во вселенной
> Без упованья и любви!..

Так замыкаецца круг пачуццяў, перажыванняў, настрояў, вельмі характэрных для часу Лермантава. Такія-ж матывы гучаць і ў лірыцы. Асабліва яркі верш «Выхожу один я на дорогу», дзе ўсё замкнута ў формулу адвечных пошукаў свабоды і забыцця.

> Уж не жду от жизни ничего я
> И не жаль мне прошлого ничуть;
> Я ищу свободы и покоя!
> Я б хотел забыться и заснуть!

Усе героі разгледжаных твораў супярэчлівы і дваісты. Яны поўны сіл, надзей, сканцэнтрыраванай волі, але яны раз'едзены рэфлексіяй, сумненнем, няўпэўненасцю. Адсюль песімізм, бесперспектыўнасць, пагібель. Яны пакутуюць, яны адзінокі, ізаліраваны, не благаслаўляюць мінулае, адмаўляюць сучаснае і не маюць будучага.

IV.

Спробы вырашыць пытанні жыцця шляхам адыхода ў паэзію, любоў, прыроду, шляхам смірэння складаюць цэлы цыкл твораў Лермантава.

Жаданне адыйсці ад рэчаіснасці адчуваем мы ў такіх творах, як «Ветка Палестины», «Дубовый листок оторвался от ветки родимой», «Когда волнуется желтеющая нива».

Матыў любві распрацован Лермантавым вельмі поўна і своеасабліва. Своеасаблівасць заключаецца ў тым, што любоў не шчасце, не паўната жыцця, а трагедыя, любоў поўна асуджанасці, раздвоенасці, супярэчнасцей, пакут. «Отчего», «Завещание», «Слышу ли голос твой», «Любовь мертвеца», «Расстались мы», «Нет, не тебя», «Ребенку» і шмат іншых твораў паказваюць нам самыя разнастайныя формы, усю гаму перажыванняў любві. Галіна паэзіі была найбольш падыходзячай для адыхода ад супярэчнасцей жыцця, ад пошласці і надаедлівасці свету, ад акружаючых людзей, да нізкага ўзроўню якіх ён павінен быў прыстасоўвацца. Толькі тут у галіне мыслі і мары, у галіне паэзіі станавіўся ён сам сабою. Яго аналіз, яго ацэнка людзей, грамадства, радзімы, асобных пачуццяў і перажыванняў не стрымліваліся нічым. Палёт яго мыслі быў імкнёны і смелы. Аднак, знайсці заспакаенне у галіне паэзіі было немагчыма, таму што і па свайму характару і па поглядах Лермантаў быў не сузіральнік, а паэт-змагар.

Паэт-змагар, ён павінен клікаць на бой, і Лермантаў смуткуе аб тым, што гэта вялікая задача паэзіі забыта. Ён ушоў у паэзію ад барацьбы, але паэзія зноў вярнула яго да барацьбы. Такія супярэчнасці Лермантава.

Прырода, любоў, паэзія — былі сферамі, куды наш паэт уходзіў ад пакутлівых супярэчнасцей, гэта былі спробы знайсці гармонію жыцця, заспакоіць боль пакутуючых розуму і сэрца. Але выйсце было мнімае, бо супярэчнасць была плодам не асабістай мыслі паэта, але самых грамадскіх адносін.

V.

Паэзія Лермантава адзіная, але яна саткана з супярэчнасцей. Сама эпоха была супярэчлівай, што абумовіла пераходнае становішча духу, калі старое разбурана, а новае яшчэ не створана. Намечаныя намі лініі ў творчасці Лермантава раскрываюць усю глыбіню яго матываў, вобразаў, пачуццяў, настрояў, перажыванняў. Тут няма паслядоўнасці, ўсё ідзе разам: побач з рэвалюцыйнымі настроямі — сумненні і хістанні, побач з імі матывы ўходу і прымірэння з рэчаіснасцю. Лёгка зразумець, што пратэст Лермантава не мог быць даведзен да канца, ён быў абмежаваны, паслаблены, што было абумоўлена самой эпохай. Справа ў тым, што ён разумеў і адчуваў: так жыць нельга, а як жыць інакш — не ведаў. Сучаснасць адмаўляў, але якое будучае і дзе да яго шляхі—не ўяўляў. Адсюль песімізм і расчараванне. Выйсце-ж ляжала ў звароце да народа, але народа, як рэвалюцыйнай сілы, у 40 годы Лермантаў не бачыў, як не бачыў яго Герцэн, па сцверджанню Леніна, і другія сучаснікі. Але Лермантаў адчуваў народную праўду і адгадваў верную дарогу. Вось чаму так дзіўна, глыбока-народна яго «Песня про купца Калашникова», яго «Родина», «Валерик» і іншыя творы:

> Люблю отчизну я, но странною
> любовью!
> Не победит ее рассудок мой...

Такія былі адносіны паэта да народа, паэтам якога ён станавіўся стыхійна. Перад ім ляжала шырокая дарога, «кіпучая натура яго пачала ўстанаўлівацца, у душы абуджацца прага працы і дзейнасці, а арліны позірк спакойней стаў углядацца ў глыбіню жыцця» (В. Белінскі). Багацце ідэйнае і вобразнае дае нам магчымасць разглядаць у Лермантаве вартага прадаўжацеля Пушкіна і бліскучага папярэдніка Льва Талстога, Дастаеўскага, Тургенева, Некрасава, Чэхава і інш. Ён быў мастаком сусветнага маштаба, а ў нашай гісторыі літаратуры яго творчасць прадстаўляе самабытны і арыгінальны раздзел.

ВІЛЬНА

(Заметкі)

Выканан загад наркома — Вільна занята часцямі Чырвонай Арміі. «Рыцары» «Рэчы Паспалітай» ганебна адступаюць. найбольш разумныя з афіцэраў адмовіліся ў гэту ноч падняць руку супроць Чырвонай Арміі. Стомленыя танкісты і коннікі ахоўваюць горад. бо хто ведае, на што здольны вораг у агоніі. Камандзіры падазрона аглядаюць званіцы касцёлаў. іх у горадзе шмат. На некалькіх касцёлах знойдзены кулямёты. Кожны касцёл — крэпасць. Для Чырвонай Арміі бяспечнасць мірнага насельніцтва — першачарговы, непасрэдны клопат.

***

Раніца была ясная. сонца пачынала скупа, але падбадзёрваюча абаграваць. Адчыніліся першыя форткі, дзверы дамоў, паявіліся першыя жыхары. Пры першых прывітальных воклічах чырвонаармейцаў твары людзей, спачатку перапалоханыя, расплываліся ва ўсмешку, рука ўзнімалася для прывітання.

Горад не спаў, але рабіў выгляд, што спіць, і калі адчуў, што няма больш ніякай небяспекі, што новае войска, заняўшае горад, па-людску адносіцца да насельніцтва, быццам прачнуўся.

Вуліцы напоўніліся людзьмі. Небяспека мінула. Насельніцтва радавалася. Пачалі паяўляцца чырвоныя сцягі. Прадстаўнікі Чырвонай Арміі увайшлі ў будынак ужо былога ваяводства і магістрата. Пачало адчувацца дыханне новага жыцця.

Праз 2 гадзіны па гораду быў расклеен загад начальніка гарнізона гор. Вільна. Загад патрабаваў у першую чаргу спакою насельніцтва — асновы рэвалюцыйнага парадку. здачы зброі і безадкладнага адналення, у мэтах беспераыннага забеспячэння насельніцтва, гандлю.

Жыццё ўваходзіла ў нармальную каляю. Вуліцы запоўнілі натоўпы ажыўленага, радасна ўзбуджанага народу. Само насельніцтва актыўна дапамагала Чырвонай Арміі — лавілі ў натоўпе шпікоў дэфензівы, пераапранутых паліцэйскіх. Ля будынка былога ваяводства чарга здаючых зброю. чарга рэгіструючыхся кадравых афіцэраў запаса. Стары адстаўны генерал прынёс бульдог і шпагу. у вачах яго страх. Малодшы камандзір Чырвонай Арміі з абыякавым выглядам прыняў ад яго зброю і далікатна прапанаваў аслабаніць месца для другога. таксама здаючага зброю. Генерал спалохана пасоўваецца к выхаду. Нехта пажартаваў: «Татачка. не затрымлівайце іншых. аслабаніце месца». Татачка. забыўшы надзець шапку, адыходзіў «на трэцяй хуткасці».

Ваявода. бургамістр. гарадскі куратар. паліцэйпрэзідэнт ўцяклі напярэдадні ў Літву.

***

Горад Вільна параўнальна вялікі. але культурнае абслугоўванне насельніцтва адзіўляюча слабае. На першым плане штодзённага культурнага жыцця — кінотэатры. Іх у горадзе дванаццаць. уладары. вядома. прыватнікі. Рэпертуар фільмаў: прыгодніцкія карціны. польскія гававакружыцельныя баявікі аб сіле польскай «дзяржавы», парнаграфія (так званыя інтымныя карціны). Публіка заходзіць і выходзіць безупынным патокам. сістэма сеанса адсутнічае. Гэтую бедную гледзельную культуру дапаўняюць два польскіх тэатры — польскі гарадскі тэатр драмы і польскі тэатр аперэты «Лютня».

— Публіка не любіць класічнай драмы. — скардзяцца акторы польскага драматычнага тэатра. — ім дай бытавую буржуазную п'есу.

— А хто-ж у асноўным наведвае тэатр. — запыталі мы.

— Гандляры. чыноўнікі, арыстакраты. — атрымалі мы адказ.

Усе пастаноўкі хуткаспелыя. афармляюцца наспех. Савецкія п'есы. вядома. забаронены.

Тэатр аперэты паспігла няшчасце. Летні сезон тэатр працаваў у Татрах (курортная мясцовасць). У часе пераезда тэатра аперэты ў Вільна пачаліся імклівыя дзеянні германскіх войск. Дэкарацыі і касцюмы затрымаліся недзе ў дарозе. Тэатр застаўся з адной «Сільвай».

У горадзе некалі існавалі тэатры: беларускі, рускі і яўрэйскі. Пад націскам паліцыі з дня ў дзень работа гэтых тэатраў, пазбаўленых памяшкання, базы, звялася да нуля. Яны ператварыліся ў гурткі, сышлі ў падполле і зніклі зусім. У першыя-ж дні прыхода Чырвонай Арміі ў часовае ўпраўленне з'явіліся прадстаўнікі калектываў гэтых трох тэатраў і ім было вызначана права на жыццё, прадастаўлены памяшканні.

Вулічныя акрабаты, бяздомныя скрыпачы па дварах, прычым скрыпачы з адукацыяй кансерваторыі — здабытак двароў і плошчаў горада Вільна. Зараз гэтаму пакладзен канец. Работнікі эстрады аб'ядналіся і прыступілі да работы.

***

21 верасня паліторганы часцей Чырвонай Арміі арганізавалі паказ ва ўсіх кінотэатрах горада савецкіх кінофільмаў. Ішлі «Ленін у 1918 годзе», «Ленін у Кастрычніку», «Граніца на замку», «Волга-Волга» і інш. Трэба было бачыць людскую чаргу ля касы кінотэатраў, каб пераканацца, якія адносіны пераважнай часткі насельніцтва да савецкай навінкі, да людзей, якія прынеслі новае жыццё Заходняй Беларусі. Савецкі кінофільм, гутарка з байцом Чырвонай Арміі, савецкая газета, загад камандавання Чырвонай Арміі, ахоўваючай парадак — усё гэта захапляе навізной і сведчыць аб пачатку новага сапраўднага чалавечага жыцця.

Стары прафесар-філолаг Віленскага універсітэта прышоў у часовае ўпраўленне заявіць, што ў такім-та маёнтку знаходзіцца бібліятэка, у якой ёсць рукапісныя каштоўнасці вялікага навуковага значэння. Ён баіцца, каб яе не знішчылі марадзёры і бандыты. У маёнтак пасылаецца прадстаўнік часовага ўпраўлення, ён арганізуе на месцы сялянскую ахову.

Землямер Н. тры годы без працы. Твар яго ажывае, калі ён тут-жа на месцы атрымлівае назначэнне. Работы землямеру хопіць — ідзе раздзел памешчыцкіх земляў.

Уладар аднаго з кінотэатраў у дзень прыхода Чырвонай Арміі зволіў касіршу — гаспадару прапануюць аднавіць на службе пацярпеўшую. У чарзе уладары кніжных магазінаў, яны прынеслі дакладныя запіскі аб наяўнасці літаратуры ў магазінах. Прышлі літоўцы — прадстаўнікі літоўскай калоніі. Літоўцаў праследавалі палякі. Заўтра ў іх сход, яны запрашаюць на сход прадстаўніка часовага ўпраўлення. Прышлі дырэктары школ — заўтра пачынаецца нармальная работа пачатковых школ і гімназій. Жыццё горада б'е поўным, некалькі прыўзнятым, але яўна прыходзячым у норму пульсам.

Там-сям бандыты з-за вуглоў працягваюць пужаць стрэламі горад, імкнучыся парушыць спакойны разбег жыцця. Захопленыя са зброяй у руках, яны аддаюцца палявому суду. Гэта былыя афіцэры былой польскай арміі і гімназісты з арыстакратычных сямей.

Па вечарах вуліцы горада заліты яркім святлом. 21 верасня на ўсіх плошчах загаварылі магутныя рэпрадуктары. Гаварыла Масква, станцыя імя Камінтэрна. Не гледзячы на дождж, ля гучнагаварыцеляў збіралася шмат народу.

З кожным днём адкрываецца ўсё больш і больш магазінаў, сталовых, кафе. Уступіла ў свае правы планамернае. нармальнае жыццё. На вуліцах чуецца смех, жарты. Распачаўся запіс рабочых у гвардыю. Узброеныя рабочыя ўзялі ў свае рукі упраўленне гарадскім парадкам. Чырвоная Армія зрабіла ўсё, каб вуліцы горада дыхалі сапраўды мірным жыццём.

В. ГЛАЗЫРЫН.



Па гарадах і сёлах Заходняй Беларусі.

На здымку: жыхары гор. Роўна чытаюць афішу аб дэманстрацыі першага савецкага кінофільма «Выбаргская старана». Фота-клішэ ТАСС.

Работнікі літаратуры і мастацтва ў Заходняй Беларусі

Амаль штодзённа з Мінска ў гарады Заходняй Беларусі выязджаюць брыгады работнікаў літаратуры і мастацтва для дэманстрацыі велізарнейшых дасягненняў сацыялістычнай культуры Беларускай Савецкай Сацыялістычнай Рэспублікі.

8 кастрычніка ў Беласток выехала брыгада пісьменнікаў і паэтаў БССР у колькасці 17 чалавек. На чале брыгады — народныя паэты БССР ордэнаносцы Янка Купала і Якуб Колас. У брыгаду увайшлі пісьменнік-ордэнаносец Змітрок Бядуля, тт. Клімковіч, Аксельрод, Маўр, Камянецкі, Фінкель і інш. Пісьменнікі правядуць рад творчых вечароў і прымуць актыўны ўдзел у падрыхтоўцы да выбараў у Народнае Сабранне.

Разам з пісьменнікамі выехалі брыгады кампазітараў і мастакоў. Сярод кампазітараў — тт. Шчэглоў, Аладаў, Іваноў, Самохін, Палонскі, Пацкавыраў і інш. У брыгаду мастакоў увайшлі мастак-ордэнаносец тав. Алтуф'еў, Ізмайлаў, Здачоўская, Забораў, А. Волкаў і інш. Мастакі прымуць актыўны ўдзел у афармленні памяшканняў, дзе адбудуцца выбары ў Народнае Сабранне.

У той-жа дзень у Заходнюю Беларусь выехаў Заслаўскі калгасна-соўгасны тэатр. У рэпертуары тэатра — «Партызаны» К. Крапівы, «Пагранічнікі» Бэль-Белацэркоўскага і «Слава» Гусева. Тэатр прабудзе ў Заходняй Беларусі цэлы месяц.

У бліжэйшыя дні ў Заходнюю Беларусь выязджае калектыў Дзяржаўнага Яўрэйскага тэатра БССР. Калектыў падзелен на дзве брыгады. Адна брыгада павязе з сабою пастаноўку «Тэв'е-малочнік», другая — «Гершэле Астраполер». Абедзве брыгады маюць у сваім рэпертуары канцэртныя аддзяленні. Тэатр прабудзе ў Заходняй Беларусі звыш двух тыдняў.

Таксама ў бліжэйшыя дні выедзе ў Заходнюю Беларусь на гастролі Тэатр юнага гледача БССР імя Крупскай. Рэпертуар ТЮГ'а: «Цудоўная дудка» В. Вольскага і «Блакітнае і ружовае» А. Бруштэйн.

Апрача тэатральных калектываў у гарады Заходняй Беларусі выязджае вялікая колькасць канцэртных брыгад, якія маюць у сваім складзе музыкантаў, актораў, чцяцоў.

У бліжэйшы час у Заходнюю Беларусь выязджае Віцебскі Белдрамтэатр. Тэатр прабудзе ў Заходняй Беларусі некалькі месяцаў.

***

7 кастрычніка вярнуліся з паездкі па гарадах Заходняй Беларусі два калектывы Беларускай дзяржаўнай філармоніі: ансамбль песні і пляскі і аркестр беларускіх народных інструментаў. Абодва калектывы далі 47 канцэртаў. Яны наведалі гарады: Ваўкавыск, Беласток, Баранавічы, Слонім, Маладзечна, Вільна і Ашмяны. Выступленні калектываў Філармоніі карысталіся велізарнейшым поспехам.

Гэтымі днямі ў Заходнюю Беларусь для ўдзелу ў падрыхтоўцы да Народнага Сабрання выязджаюць усе чатыры калектывы Філармоніі: сімфанічны аркестр, хор, ансамбль песні і пляскі і аркестр беларускіх народных інструментаў.

Новыя эскізы беларускіх мастакоў

У апошні час выставачным камітэтам прыняты новыя эскізы. Цікавыя эскізы былі прадстаўлены жывапісцамі Дажанскім і Пашутай. Мастак Дажанскі прадставіў эскіз на тэму «Гутарка ў калгасе», а Пашута — эскіз «Мінскія рабочыя ўходзяць на фронт».

Выстаўком прыняў для прадстаячай выстаўкі «Ленін і Сталін — арганізатары беларускай дзяржаўнасці» рад каштоўных эскізаў, распрацаваных засл. дзеячом мастацтваў З. Азгурам. Перш за ўсё трэба адзначыць эскіз «Сталін за работай». У гэтым эскізе тав. Азгур імкнецца паказаць вобраз вялікага правадыра ў момант рэдакціравання ім маніфеста аб стварэнні Беларускай Савецкай Сацыялістычнай Рэспублікі. У другім эскізе «Маркс і Энгельс» Азгур паказвае вялікіх пачынальнікаў марксізма за гутаркай. Выставачны камітэт прыняў для выстаўкі таксама закончаны ў апошні час Азгурам бюст Серго Орджанікідзе.

Вялікія спрэчкі выклікаў на выстаўкоме эскіз засл. дзеяча мастацтваў А. В. Грубе «В. І. Ленін на трыбуне». Гэты эскіз вылучаецца смеласцю замысла і кампазіцыі, якая ўключае ў сябе значныя архітэктурныя элементы. Скульптар імкнецца перадаць момант выступлення В. І. Леніна перад войскамі, якія адпраўляюцца на белапольскі фронт. Эскіз з нязначнымі папраўкамі выстаўкомам прынят.

ВЕРШЫ СЯРГЕЯ ХМАРЫ

Кожны, хто любіць паэзію, верыць у яе неабмежаваныя магчымасці, лічыць яе справай надзённай, жыццёвай неабходнасцю, а не бяздзейным капрызам і бяздзеліцай, знойдзе сабе ў вершах Сяргея Хмары (зборнік «Жураўліным шляхам», Вільна, 1939 г.) нечакана-моцнае і неабвержнае падтрыманне. Вершы Сяргея Хмары выдадзены на працоўныя грошы заходне-беларускіх сялян, на капейкі, сабраныя галадаючымі беларусамі. Над гэтым варта задумацца, каб зноў, з асаблівай відавочнасцю, адчуць у гэтым адным невялікім факце, узятым непасрэдна з жыцця, нечакана ўзросшае значэнне і аўтарытэт паэзіі.

У кнізе «Жураўліным шляхам» вельмі мала сузіральных радкоў. Усё лепшае, што ёсць у зборніку, звязана з інтанацыяй барацьбы, з настроем радаснага прадчування і надзеі. Здзіўляешся блізасці тэм і матываў вершаў Сяргея Хмары да матываў і тэм дарэвалюцыйных вершаў Купалы і Коласа. І тыя і гэтыя вершы народжаны роднымі сітуацыямі, паднявольным становішчам беларускага народа пры рускім феадальна-капіталістычным ладзе, у адным выпадку, і ва ўмовах прагнюўшай польскай дзяржаўнасці, у другім. Сітуацыя паўтарылася — паўтарыліся і вершы:

Зазванілі яму, зазванілі,
Як на вечны пакой вынасілі...
Не званы зазванілі ў касцеле —
Але гора дзяцей зсірацелых,
Гора жонкі, бацькоў над труною
Зазваніла сялянскай слязою...

Гэта — вершы С. Хмары. У іх яўна адчуваюцца галасы нашых народных паэтаў. У кнізе «Жураўліным шляхам» многа вершаў, якія рысуюць прыгнечанасць і забітасць беларускага сялянства, якое стагнала пад прыгнётам польскага пана. Уся кніга насычана пафасам сапраўднага «мужыцкага» дэмакратызма. У праграмным вершы «Мы» Сяргей Хмара зло парадыруе галасы тых «культурных» эстэтаў, якія лічылі сваім абавязкам абараняць «свяшчэнную» галіну паэзіі ад «мужыцкіх» «пасягацельстваў».

Лапцем лезе лазовым,
Брудзіць нам хараство.

Як тут не прыгадаць першых вершаў Купалы і Коласа, у якіх яны з цвёрдай паслядоўнасцю адваёўвалі для народа, для «мужыка» забароненую галіну паэзіі? Сяргей Хмара — прамы наследнік лепшых дэмакратычных традыцый беларускай літаратуры.

Чуеш! Небам ідуць жураўлі,
а зямлёй
гучны марш граюць лапці.

Гэты «лапцёвы марш» бесперапынна гучыць і з старонак паэзіі Сяргея Хмары. Паэт знаходзіць праніклёныя словы для тых, хто часова скаўзнуўся, збочыў, «здаўся ў бітве з бядой». Вось верш, адрасаваны другу-паэту:

І ці быць гэта можа?
Ты косць з косці, з крыві
З вёскі нашай...
А ці зможа якая
Нас, байцоў, зьлыбяла?
Нас, прадвеснікаў мая
У зімовых лядах!
Трэба? — галовы зложым; —
Трэба? — целам, касцьмі!
Шлях бяздольным пралажым,
Нам паляць, а не цвіць!

І як заканамернае і натуральнае прадаўжэнне таго-ж матыва гучаць энергічныя і выразныя радкі з другога верша:

Нам не чакаць вясны
З замкнутымі вачамі.
Не сніць аб ёй начамі. —
Бо сны і будуць сны.

Паэзія С. Хмары выражае жаданне актыўнага рэвалюцыйнага дзеяння, радаснае імкненне да сонца, да вясны. «Ці-ж то нам ніколі сонца не засвеціць?» — пытаецца паэт у адным з сваіх вершаў. і адказвае ў другім: «Прыедзе вясна к нам на сонцы-коні!». С. Хмара з тымі і за тых, хто «грудзі раніцы аб скалы, сонца, сонца здабывалі...»

Па вершах Сяргея Хмары можна бачыць, як нашы родныя браты-беларусы, знаходзячыся пад гнётам польскага пана і асадніка, будучы асуджаны на бесчалавечнае і рабскае існаванне, з непаслабляючай цікаўнасцю сачылі за намі, за нашай савецкай краінай. У якасці прыклада дастаткова прывесці характэрны, напісаны ў духу народнай песні, верш С. Хмары:

Гускі, мае, гусачкі,
Скіньце мне па пёрачку!
Паляцела-б з вамі я
У родную старонačку,
Дзе жыццё шчаслівае
Дзе жыццё вясёлае...

Шчасліва абмінуўшы цэнзурныя рагаткі, гэты верш прышоў здалёку, з нядаўняга, але з беззваротнага мінулага, як братэрскае прывітанне. За гэтыя вершы Сяргей Хмара расплачваўся катаваннямі і турмой. Дарагая цана! — і аб ёй ніколі не трэба забываць.

Вялікае месца ў вершах С. Хмары займае матыў працы. Вершы «Землякопы», «Зялёная Прыпяць», «Капаем», «Краўчыха» распрацоўваюць тэму паднявольнай працы.

Капаем без слоў, без гуку ў ціпы.
Лёг цень на галодным аблічы.
Рве крык прыганятага: — гэй, паспяшы, —
Бо зноў вашы рэбры палічым!

Гэта з верша «Капаем». У ім мы сустракаем вельмі дакладны і вельмі эканомны радок, які перадае ўвесь невыносны цяжар працы пад бізуном прыганятага: «Нам сонца з сарочак выпарвае дым». Ці ў другім вершы «Краўчыха», змучаная непасільнай працай краўчыха гаворыць аб сабе: «Толькі начамі сонца мне сніцца...» Сонца сніцца па начах толькі тым, каму заўсёды згорбленая спіна і гаротныя слёзы не даюць магчымасці бачыць яго на яве.

У вершах С. Хмары яшчэ шмат павярхова-рытарычнага, шмат агульных слоў і маланатуральных вобразаў. Але не гэта галоўнае ў зборніку «Жураўліным шляхам». Чытаючы зборнік, адчуваеш вялікую і шчырую радасць ад усведамлення той выключнай ролі, якую адыгралі гэтыя к часу напісаныя вершы.

Г. БЯРОЗКІН.

ВЫЗВАЛЕНАМУ БРАТУ

Не трубіў на зары гарніст,
Не грымела аркестраў медзь.
Скрозь асенняга ветру свіст
Паляцела на панства смерць.
Помніць Нёман, Дзвіна і Буг
Нашых танкаў нагрозны гуд.
Ты пазбыўся навекі, друг,
Белапольскіх іржавых пут.
Гнеўны шквал па зямлі прайшоў
І развеяў туман тугі.
Старажытныя замкі князёў
Асвяцілі нашы сцягі.

Не забыць мне, як неслі хлеб-соль
Нам на вышытых ручніках.
Як дзяўчаты з вакольных сёл
Кветкі сеялі на шляхах.
Расступаліся дрэвы з дарог,
Шляхту біў, маланіў кулямёт...
Слава тым, хто пад Вільнай лёг,
Слава тым, хто пад Гроднам лёг,
За цябе, беларускі народ!...
Вольны брат, засявай палі,
Насыпай буйным зернем засек.
Мы прагналі з тваёй зямлі
Каўтуновае гора навек!

ПІМЕН ПАНЧАНКА.

С. ДУРЫЛІН

Лермантаў — драматург

У творчасці Лермантава яго драмы, напісаныя ў 1830—1836 гадах, займаюць асобнае месца. яны адзначаны глыбокай страсцю рамантычнага парыва. Да іх, больш чым да якіх-небудзь іншых твораў Лермантава, можа быць прыменена яго больш позняе журботна-іранічнае прызнанне:

Любил и я былые годы,
В невинности души моей,
И бури шумные природы
И бури тайные страстей.

«Бури тайные страстей» — гэта лепшае вызначэнне не толькі першай з драм Лермантава — «Іспанцы» (1830). але і самай мастацка-спелай з іх — «Маскарад» (1834—1835).

У драмах Лермантава свае тэмы, свае ўнутраныя задачы, свая любоў і нянавісць. Кожная яго драма з'яўляецца яго асабістай споведдзю. Юрый у «Людзях і страсцях», Уладзімір у «Дзіўным чалавеку», другі Юрый у «Двух братах» — гэта сам Лермантаў у рамантычным абліччы, але з жывой праўдай пачуццяў, з гарачай мэтаімкнёнасцю мяцежнай мыслі. Ніводнаму з гэтых герояў драм Лермантава (да іх можна дадаць яшчэ Фернанда з «Іспанцаў») няма месца ў акружаючым жыцці і асяроддзі.

Кожны з іх — адзінокі адшчапенец, непакорны бунтар супроць пануючага ўклада жыцця. У кожнага з іх сэрца б'ецца вальней, чым у яго раўнеснікаў і сучаснікаў. Вось чаму ім аднолькава цесна і ў Іспаніі часоў інквізіцыі, і ў Маскве эпохі Нікалая І.

Драмы Лермантава — не проста рамантычныя п'есы. Рамантыкам лічылі сябе і Кукальнік, і Нікалай Палявой, што пісалі п'есы, за якія Нікалай І узнагароджваў іх дыямантавымі пярсцёнкамі. Але ў той час, як у рамантычных п'есах Кукальніка і Палявога славутая трыяда «праваслаўе — самадзяржаўе — народнасць» абвалаквалася ў мніма-паэтычныя формы, — рамантычныя драмы юнака Лермантава ўсе былі насычаны пачуццямі і мыслямі, заклікаўшымі да вызвалення чалавека ад ланцугоў усякага прыгнечання.

У драме «Іспанцы» гучыць гарачы пратэст супроць прыгнечання народнасцей і супроць клерыкальнага дэспатызма. У драме «Людзі і страсці» нельга не бачыць такога-ж гарачага пратэста супроць сямейнага прыгнёту. У «Дзіўным чалавеку» Лермантаў далучае свой абураны голас да тых, хто вёў барацьбу супроць прыгоннага права. Сцэна з «мужыком» у гэтай п'есе ярка адлюстроўвае жахі прыгоннага права. «Мужык сівы» расказвае аднаму з персанажаў п'есы Белінскаму: «Раз неяк сказалі пані, што моў, «Федзька дрэнна пра цябе гаворыць і хоча ў горадзе паскардзіцца», — а Федзька мужык быў слаўны. Вось яна і загадала выкручваць яму рукі на станку... А ўпраўляючы быў сярдзіты на яго. Як павялі яго на панскі двор, дзеці крычалі, жонка плакала. Вось пачалі выкручваць рукі. «Пан управіцель! — сказаў Федзька, — што я табе зрабіў. Ты мяне губіш!» — «Глупства!» — сказаў управіцель... ды выкручвалі, ды ламалі. Федзька і стаў бязрукім. На печы так і ляжыць, праклінае сваё нараджэнне...»

Белінскі, поўны абурання, прарывае гэтае страшнае апавяданне:

«Ды што, на самай справе, хто-небудзь з суседзяў, ці спраўнік, ці гараднічы не паладуць на яе (лютую памешчыцу — **С. Д.**) просьбу. На гэта ёсць у нас суд. Вашай пані дрэнна можа быць».

У адказ на гэтыя супакойваючыя словы чалавека, які верыць у існаванне законнасці ў дваранска-самадзяржаўнай імперыі Нікалая І. «мужык» адказвае:

«Дзе абаронцы ў бедных людзей! У пані-ж усе суддзі падкуплены нашым-жа аброкам».

Прыведзены эпізод з «мужыком» паказвае, да якой рэалістычнай сілы даходзіў пратэст у юнацкіх драмах Лермантава супроць існуючых парадкаў.

Сам паэт, строгі да сваёй творчасці, лічыў гэтыя драмы толькі падрыхтоўчымі эцюдамі, чарнавымі накідамі будучых, больш дасканалых твораў, і не думаў ні аб друкаванні, ні аб паказе іх у тэатры. Але няма сумнення, што цэнзура не дапусціла-б друкавання і паказу юнацкіх драм Лермантава: настолькі яркі быў іх вызваленчы пафас!

Першай і адзінай сваёй драмай, вартай тэатра, Лермантаў прызнаў «Маскарад», напісаны ў 1835 годзе. — і драма зараз-жа выклікала адмоўны водзыў цэнзара Ольдэкопа: «Не ведаю, ці можа прайсці п'еса нават са змяненнямі», а з тайнай паліцыі (3-га аддзялення), драма была звернута Лермантаву для «патрабных змен». Лермантаў, які страсна жадаў бачыць драму на сцэне і спадзяваўся захаваць у ёй усё самае істотнае, прыбудаваў к «Маскараду» новы, чацверты акт. Але і ў такім выглядзе драма была забаронена. У кастрычніку 1836 года Лермантаў прадставіў у цэнзуру трэцюю рэдакцыю сваёй драмы пад назвай «Арбенін», але і на гэты раз драма трапіла пад забарону.

Толькі шмат год пасля смерці Лермантава яго «Маскарад» мог убачыць святло рампы.

Чаму-ж цэнзура так упарта і доўга змагалася з рамантычнай драмай Лермантава?

Лермантаў працягваў у «Маскарадзе» справу Грыбаедава, распачатую у «Горы ад розуму».

Грыбаедаў напісаў сатырычную камедыю з жыцця вышэйшага грамадства. Лермантаў напісаў сатырычную драму з жыцця таго-ж грамадства. Але ён узяў яшчэ больш высокі слой дваранскага грамадства: у Грыбаедава — сонная дваранская Масква, у Лермантава — урадавы Пецярбург.

Нікчэмнасць свайго асяроддзя Лермантаў выкрывае з прадзельнай едкасцю. Вось «вялікі свет» — маскарад. Пад маскамі арыстакратычнай чыннасці і чапорнай благапрыстойнасці схаваны наглая дзёрзкасць распусты, прагнасць да нажывы, страсць да золата, абураючая нікчэмнасць мыслі і пачуцця, прыніжанасць чалавечай годнасці жанчыны. Апрануўшы на сябе стракатае даміно ў бал-маскарадзе, людзі зрываюць з сябе ўсе маскі прыстойнасці, якія носяць у жыцці.

У «Маскарадзе» агульны фон, агульная глеба для ўсіх — гэта прага золата. Шалёная пагоня за ім па зялёным полі складае самы сюжэт п'есы. Большасць «іграноў» — гэта збяднеўшыя дваране, якія аднаўляюць сваю прагніўшую прыгонніцкую эканоміку сумніцельнай прамысловасцю чырвоннага туза. Лермантаў зло высмейвае дваранскія поспехі на гэтым адыходніцкім картачным промысле. Князь Звездзіч толькі пачынае першыя вопыты. пакуль яшчэ без поспеху. Казарын знаходзіцца ў няўстойлівай роўнавазе паміж удачай і няўдачай промысла. Арбенін ужо найграў сабе багацце і адкінуў ад сябе карты.

Фігуры «Маскарада», у параўнанні з персанажамі «Гора ад розуму», ясней за ўсё паказваюць, як глыбока, пасля нараджэння дзекабрыстаў, вышэйшае грамадства шагнула ў гразь маральнага разлажэння. Паказваць гэта на сцэне — значыла выносіць смяротны прыгавор гэтаму грамадству — і ўрад Нікалая І забараніў п'есу Лермантава.

Лермантаўскі «жалезны верш, абліты горыччу і злосцю» не маглі стрымаць ніякія цэнзурныя забароны і жандарскія ўрокі: верш гэты выкрываў, абураўся і караў вольна і неўёмна.

Грыбаедаў супроцьставіў Фамусаву і Малчаліну вольнадумца мыслі — Чацкага. Лермантаў супроцьпаставіў баранесам і князям Звездзічам вольнадумца пачуццяў і жыццёвай маралі — Арбеніна.

«Ні ў чым і нікому ў жыцці я не быў абавязан», — гаворыць Арбенін. Як Пячорын, Арбенін мог-бы сказаць пра сябе: «Я адчуваю ў душы маёй сілы неабдымныя». Лермантаў надаў Арбеніну немалы запас сваёй уласнай тонкай іроніі, высокай журбы і палымнеючай нянавісці. Лермантаў насыціў Арбеніна тым-жа духам пратэста, якім сам быў поўны і які так любіў і шукаў у Байране. У гэтым сэнсе Арбенін адзін з самых яркіх рамантычных вобразаў, якія толькі ёсць у рускай паэзіі: адзінокі адшчапенец з мяцежным духам.

Але Лермантаў з такой-жа суровай праўдзівасцю аднёсся і к Арбеніну, як і к іншым дзеючым асобам «Маскарада». Арбенін з усім сваім розумам, з усёй сілай свайго пачуцця, з незвычайным багаццем характара, з цвёрдым гартам волі аказваецца ў заганным коле, з якога няма іншага выхаду, як у пошлае існаванне альбо на гібель. Для яго розуму няма матэрыялу, для яго пачуцця няма прастору, для яго сіл няма прыстасавання ў тых жыццёвых умовах, якія стварала прыгонная і паліцэйская дзяржаўнасць Нікалая І.

Яго здольнасць самааддана, глыбока аддавацца ахопліваючай яго страсці знаходзіць сабе нікчэмны выхад у пустых хваляваннях картачнай ігры. Яго жалезная воля не знаходзіць сабе вартага прыстасавання. Яго халодная разумная пагардлівасць да вялікасвецкай чэрні не вядзе ні да якога дзеяння, апрача злых і едкіх эпіграм, якія ён зрэдку кідае па адрасу выродкаў са свецкай чэрні.

«Геній, прыкаваны да чыноўнічага стала, павінен памерці ці звар'яцець», гаворыць Пячорын. Чалавек з непакорным сэрцам і няздомнай воляй, прыкаваны да рускай сапраўднасці нікалаеўскай эпохі, павінен быў страціць свае сілы па-пустому, павінен быў знясіліць сябе ў барацьбе пустой і загінуць бясплодна для сябе і іншых. Гэта і здарылася з Арбеніным. Яго пагібель, як і бясплодная растрата яго вялікіх сіл розуму і волі, з'яўляецца важнейшай часткай таго абвінаваўчага акта супроць нікалаеўскага рэжыма, якім з'яўляецца ўся творчасць Лермантава.

Вось чаму «Маскарад» доўгія годы быў пад забаронай для сцэны. Забарона гэта назаўсёды адкінула Лермантава ад драматургіі. Да канчатковай забароны «Маскарада» (1837 г.) Лермантавым напісаны, апрача гэтай драмы, яшчэ чатыры п'есы і накіданы некалькі планаў драматычных твораў. Пасля 1837 года Лермантаў не напісаў і не запланіраваў ніводнага драматычнага твора: ён зразумеў, што трыбуна тэатра пры Нікалаю І для яго назаўсёды закрыта.

У савецкія часы «Маскарад» зрабіўся адной з самых любімых п'ес рускага класічнага рэпертуара. Гэта і зразумела: шчырая мяцежнасць лермантаўскай рамантыкі, невянучая свежасць верша не можа не прыцягваць савецкага гледача.

У «Маскарадзе» жыве і заўсёды будзе жыць нестарэючая праўда любві і нянавісці аднаго з самых свабодалюбівых паэтаў у свеце — вялікага Лермантава.



Ілюстрацыя к паэме «Дэман» мастака М. А. Врубеля.



Да дэкады армянскага мастацтва.

На здымку: сцэна з 2-га акта оперы «Ануш». Фота-клішэ ТАСС.

Барыс Васільевіч ШЧУКІН



Памяць аб Б. В. Шчукіне будзе вечна жыць у сэрцах яго сучаснікаў

Пісьменнікі БССР сумуюць аб заўчаснай смерці вялікага майстра совецкай сцэны, першага таленавіцейшага выканаўца ролі В. І. Леніна, народнага артыста СССР Барыса Васільевіча Шчукіна. Непараўнанае па сваёй сіле і глыбіні мастацтва Шчукіна ўзбагаціла совецкі тэатр натхнёнымі вобразамі нашай гераічнай рэчаіснасці. Совецкае мастацтва страціла бязмежна абаяльнага чалавека і мастака. Памяць аб пулоўным народным артысту будзе вечна жыць у сэрцах яго сучаснікаў.

ЯНКА КУПАЛА, ЯКУБ КОЛАС, ЗМ. БЯДУЛЯ, К. ЧОРНЫ, М. ЛЫНЬКОЎ, І. ГУРСКІ, П. ГЛЕБКА, М. КЛІМКОВІЧ, М. МОДЗЛЬ, П. БРОЎКА, АЛ. КУЧАР, М. ЛІУШЫЦ, Г. БЯРОЗКІН, Х. ШЫНКЛЕР, У. ФІНКЕЛЬ, З. АКСЕЛЬРОД, М. ЮДЗЛЕВІЧ, З. АГНЯЦВЕТ, Ю. ВІЦЬБІЧ, Е. РАМАНОВІЧ, А. АСТРЭЙКА, Г. ШВЕДЗІК.

Калектыў Беларускага Дзяржаўнага драматычнага тэатра калектыву тэатра імя Вахтангава

Разам з вамі глыбока сумуем аб заўчаснай смерці выдатнага майстра совецкага тэатра, народнага артыста СССР, ордэнаносца Барыса Васільевіча Шчукіна, стварыўшага рад выдатных сцэнічных вобразаў, з якіх вобраз правадыра пралетарскай рэвалюцыі Леніна з'яўляецца творам вялікай мастацкай сілы.

Усім народам Совецкага Саюза быў добра знаёмы Барыс Васільевіч Шчукін. Памяць аб ім доўга будзе жыць у нашых сэрцах.

ВЫДАТНЫ МАЙСТАР СОВЕЦКАГА МАСТАЦТВА

Абарвалася выдатнае творчае жыццё народнага артыста СССР Барыса Васільевіча Шчукіна. Ён прайшоў нядоўгі, але выключна яркі жыццёвы шлях, заняўшы пачотнае месца ў радзе выдатных майстраў совецкага мастацтва.

Б. В. Шчукін нарадзіўся ў 1894 годзе ў Маскве. Яшчэ ў юнацтві горача палюбіў тэатр. Яго заўсёды цягнулі да сябе буйнейшыя рэалістычныя тэатры — Мастацкі і Малы. Іх спектаклі, якія малады Шчукін наведваў пры ўсякай магчымасці, былі для яго першай школай акторскага майстэрства.

Як і большасць яго аднагодкаў, Шчукін прайшоў праз горніла імперыялістычнай вайны, радасна сустрэў Вялікую Кастрычніцкую соцыялістычную рэвалюцыю. К таму часу ў Барыса Васільевіча ўжо зусім выразна намеціласа жаданне пайсці на сцэну. Пасля звароту з арміі ён уступіў у драматычны гурток пры чыгуначным клубе і з запалам аддаўся любімаму мастацтву. Шчукін сыграў у любіцельскіх спектаклях больш 100 ролей.

У грамадзянскую вайну пачынаючы артыст становіцца байцом Чырвонай Арміі. У 1919 годзе ён прыязджае ў Маскву на курсы ваенных інструктараў. Ні на мінуту не пакідаючы сваёй заветнай мары стаць акторам, Барыс Васільевіч прысвячае вячэрнія гадзіны заняткам у маладой студыі, якой кіраваў Е. Б. Вахтангаў. Разам з іншымі студыйцамі Шчукін прышоў у тэатр Вахтангава. З гэтым тэатрам неразрыўна звязана ўсё яго творчае жыццё.

Першая ўжо роля Грэка Лымбы ў п'есе Чэхава «Свадьба» была сыграна Шчукіным свежа і ярка. У ім адразу адчуваўся актор, які ўмее ўвасабляць у сцэнічным вобразе жыццёвую праўду.

Буйны поспех Шчукіну прынёс спектакль «Егор Булычаў і іншыя», у якім ён іграў галоўную ролю. Выдатны майстар сцэны глыбока зразумеў творчы замысел вялікага пісьменніка А. М. Горкага. Ён стварыў у гэтым спектаклі надзвычай моцны і яркі вобраз чалавека з вялікімі і складанымі перажываннямі, чалавека, які змагаўся са смяротнай хваробай, не жадаў паміраць, але вельмі добра адчуваў немінучасць не толькі сваёй асабістай смерці, але і смерці свайго класа, класа капіталістаў.

Мара Шчукіна — паказаць «усю веліч людзей нашай эпохі» — ажыццявілася. На яго долю выпала пачотная і адказная творчая задача—першым з майстроў совецкага мастацтва стварыць на сцэне і ў кіно вобраз вялікага Леніна. Доўга і ўпорна працаваў над гэтым вобразам патрабавальны да сябе мастак.

Першае-ж выступленне Б. В. Шчукіна ў спектаклі «Чалавек з ружжом» глыбока ўсхвалявала гледачоў. Кожны са знаходзіўшыхся ў зале людзей, гледзячы на сцэну, атрымаў магчымасць убачыць ярка і праўдзіва створаны вобраз В. І. Леніна. Гэтая аўдыторыя бязмежна пасшыралася, калі на экран вышаў фільм «Ленін у Кастрычніку». Дзесяткі мільёнаў гледачоў убачылі любімы вобраз Уладзіміра Ільіча.

Урад высока ацаніў работу Б. В. Шчукіна, узнагародзіўшы яго ордэнам Леніна. На працягу некалькіх год Шчукін ні на мінуту не спыняў работы над велічным вобразам. Выдатныя рэзультаты яго творчай працы совецкі народ убачыў у фільме «Ленін у 1918 годзе». Створаны Шчукіным вобраз В. І. Леніна, вобраз велізарнай сілы, з'яўляецца каштоўнейшым укладам у скарбніцу соцыялістычнага мастацтва. Фільм «Ленін у Кастрычніку» і «Ленін у 1918 годзе» з хваляваннем і слязамі радасці глядзяць зараз вызваленыя народы Заходняй Украіны і Заходняй Беларусі.

Тры годы назад урад прысвоіў Б. В. Шчукіну высокае званне народнага артыста СССР.

Совецкі народ на доўгія годы захавае ўдзячную памяць аб Барысу Васільевічу Шчукіну, сваім любімым, сапраўды народным артысту, аддаўшым увесь свой магутны талент служэнню вялікай радзіме.

(ТАСС).



Провады прызыўнікаў гор. Мінска і Мінскай вобласці, якія едуць у часці Рабоча-Сялянскай Чырвонай Арміі. Фотахроніка БЕЛТА.



Будынак Вялікага тэатра оперы і балета БССР у Мінску.

„ПАВЕЛ ГРЭКАЎ"

У ЯЎРЭЙСКІМ ДЗЯРЖАЎНЫМ ТЭАТРЫ БССР

«Павел Грэкаў» — п'еса Войцехава і Ленча—ставіцца не адным тэатрам нашай краіны. І ўсюды яна сустракае прыём, якім могуць пахваліцца толькі нямногія п'есы нашага рэпертуара. «Павел Грэкаў» — выключна глыбока хвалюе аўдыторыю, месцамі ўзрушае яе, прымушае кожнага гледача войстра перажыць барацьбу і лёс асноўных дзейнічаючых асоб. У чым-жа крыецца прычына гэтага магутнага ўздзейнічання? Сіла «Паўла Грэкава» ў сапраўднай большэвіцкай партыйнасці п'есы, у яе прадзельнай праўдзівасці, чалавечнасці.

«Павел Грэкаў» з'яўляецца творам, сапраўды ўзбагаціўшым нашу драматургію, ён сведчыць аб сур'ёзнасці, шчырай усхваляванасці і праўдзівасці ў падыходзе да вырашэння совецкай, партыйнай тэмы.

Указаныя якасці п'есы і прыцягнулі да яе ўвагу Дзяржаўнага Яўрэйскага тэатра БССР, які заканчвае яе пастаноўку (рэжысёр — засл. арт. БССР Л. М. Літвінаў, мастак — І. С. Федотаў, пераклад Камянецкага, рэжысёр—асістэнт Л. Олендэр).

«Павел Грэкаў» — гэта ўсхваляваны і хвалюючы расказ аб жыцці сапраўднага большэвіка, выхаванца эпохі Леніна—Сталіна, расказ аб барацьбе яго з ворагамі нашага народа. У радзе эпізодаў п'еса расказвае аб барацьбе ворагаў народа супроць Паўла Грэкава, аб выкарыстанні імі ў сваіх мэтах дурняў і кар'ерыстаў з партбілетамі ў кішэні (дзея адбываецца з 1930 па 1937 год). Ворагі дабіваюцца выключэння Грэкава з партыі, зняцця з работы і хочуць дабіцца яго арышту. Грэкаў, выключаны з партыі, упарта прадаўжае барацьбу з ворагамі народа і разам з большэвіком-сталінцам, сакратаром райкома Кавалёвым, выкрывае іх.

Побач з Грэкавым жонка яго—комсамолка Маша, вобраз соцыялістычнай інтэлігенткі, асабістае жыццё якой і партыйны доўг цесна пераплецены з жыццём і дзейнасцю Грэкава. Вобраз лірычны і новы па псіхалагічнаму тыпу жанчыны. Рад эпізадычных ролей, як вобразы таджыкаў (першы акт адбываецца ў Таджыкістане)—Джураеў, Сатораў, Собір, вобразы рабочых на будаўніцтве ў Маскве—Трафімыч, Сенька Абрамаў, Папова, Пятроў і інш.—абмаляваны аўтарамі эскізна, але зноў-такі з вялікай цеплынёй. Моцна напісаны вобразы ворагаў — трацкіста Сарокіна, шавініста Нарзулаева, Карася, Гусейнава, Глінскага і інш. Аўтары змаглі паказаць агідную тактыку ворагаў, іх звярынае аблічча.

У абмалёўцы вобразаў Грэкава (засл. арт. Б. Сокал), Машы (засл. арт. Ю. Арончык), Кавалёва (Б. Фельдман)—заслугоўвае ўвагі ўдалая спроба аўтараў п'есы пранікнуць у глыбіню псіхалогіі людзей.

У «Грэкаве» аўтары і тэатр сталі на шлях сур'ёзнага псіхалагічнага аналізу. Пакуты Грэкава, выключанага з партыі ворагамі, пакуты Машы, удзел Кавалёва ў лёсе Грэкава — ва ўсёй карціне ўнутранай і вонкавай барацьбы, поўнай пафасам сапраўднай партыйнай страснасці —мы шукалі псіхалагічнай праўды.

Увесь спектакль вырашаецца ў плане лірычнай соцыяльнай драмы. Мы хацелі-б сілай мастацтва дабіцца таго, каб глядач забыў аб тэатры і рэальна перажыў-бы тое, што адбываецца на сцэне. А адбываецца ў п'есе вялікая свяшчэнная барацьба выхаванцаў партыі Леніна—Сталіна супроць агідных мракабесаў, якія нясуць у сабе ўсю гніль старога свету.

Л. М. ЛІТВІНАЎ,
засл. арт. БССР, пастаноўшчык спектакля

Л. БАРАГ

ПАЭТ—НАВАТАР

(Да 15-годдзя з дня смерці В. Я. Брусава)

Брусаў быў перш за ўсё наватарам. Страсныя шуканні новага ў мастацтве ён спалучаў з чулым успрыманнем усяго новага ў жыцці. У адрозненне ад іншых сімвалістаў, блукаўшых у дэбрах містыкі і фармалізма, Брусаў, выхаваны «з пялёнак» у прынцыпах матэрыялізма і атэізма, глыбока рацыяналістычна падыходзіў да рэчаіснасці. «У ім ёсць нешта ад каменшчыка, які будуе будынак чалавечай цывілізацыі, — гаворыць пра Брусава Луначарскі, — а не ад фокусніка, які на плошчы хоча здзівіць разявак».

Незвычайна шырокаму творчаму дыяпазону Брусава, аднačасова ствараўшага паэтычныя творы — і аб самых старажытных краінах свету, закінутых у тумане вякоў, і аб кіпучай сучаснасці, і аб людзях будучых пакаленняў, — адпавядае выключная шматвобразнасць паэтычных формаў, уведзеных ім у рускую паэзію. У сваіх наватарскіх вопытах, у пошуках больш свабоднага і больш гнуткага, больш зместоўнага верша ён заўсёды апіраўся на мастацкую спадчыну мінулага. Паэт-тварэц ва ўяўленні Брусава з'яўляўся «ахоўнікам таямніц», пакінутых у спадчыну мастакамі мінулага.

> Нет, мы не только творцы, мы и хранители тайны,
> В образах, в ритмах, в словах есть откровенья веков.
> . . . .
> Пиндар, Виргилий и Данте, Гете и Пушкин согласно
> В явные звуки вплели скрытых намеков черты.

Сімвалісты падыходзілі звычайна да літаратурнай спадчыны мінулага з вузкімі меркамі сваёй літаратурнай «школы». Брусаў-жа ўмеў вучыцца ў паэтаў усіх часоў і народаў, у паэтаў самых разнастайных напрамкаў і «школ». «Я аднолькава люблю і верныя адлюстраванні прыроды ў Пушкіна і Майкава, — гаворыць Брусаў у прадмове да адной з сваіх кніг, — і парыванні выразіць звышземнае ў Тютчэва, і мысліцельнае раздум'е Баратынскага, і страсныя прамовы грамадзянскага паэта, скажам, Некрасава». Пранікненне Брусава ў «таямніцы» паэзіі ўсіх часоў і народаў рабіла яго майстэрства вяршыняй паэтычнай культуры свайго часу. Нездарма Максім Горкі, які пільна сачыў за творчымі поспехамі Брусава, у адным з сваіх пісем 1917 года напісаў аб ім: «Гэта самы культурны пісьменнік на Русі», а праз шэсць год совецкі ўрад у асобнай грамаце адзначыў яго «цэнны ўклад у культуру сваёй радзімы».

Знаходзячыся на вышынях сучаснай культуры, Валерый Брусаў вайстрэй за іншых паэтаў адчуваў і прадбачыў немінучасць пагібелі буржуазнага свету. Разрыў Брусава з гэтым светам наспяваў гадамі. Яшчэ задоўга да Кастрычніка ён абвяшчаў у сваіх вершах немінучасць перамогі рэвалюцыі.

Пераход Брусава на пазіцыі соцыялізма быў вялікай перамогай гэтага выдатнага пісьменніка. З другога боку, самы факт прыхода да нас «самага культурнага пісьменніка на Русі» поўны глыбокага гістарычнага сэнсу.

* * *

Брусаў прыйшоў у рускую літаратуру вестуном і арганізатарам сімвалізма. Паводле слоў Андрэя Белага, «Брусаў адзін арганізаваў сімвалізм у Расіі». Зварот індывідуалістычна настроенага маладога Брусава, пагарджаўшага «ганебны, дробны, няправы, непрыгожы» лад рускага жыцця 90-х год, да мадэрнісцкай паэзіі з яе накіраванасцю ў «краіну маўчання і магіл», не быў выпадковым. Аднак, Брусаву была чужой і рацыянальная філасофія «новай паэзіі», яго прыцягвала ў ёй, галоўным чынам, мастацкая навізна і арыгінальнасць. Характэрна, што ў прадмове да першага выпуску «Рускіх сімвалістаў» (1894) Брусаў, сцвярджаючы права наватарскіх твораў сімвалісцкай паэзіі на ўвагу з боку чытачоў, адмаўляў сімвалізму ў сусветным значэнні, а ў неапублікаваным артыкуле «К гісторыі сімвалізма» ён у 1897 годзе выражаў простае сумненне ў жыццездольнасці сімвалізма, як ідэйнай плыні.

Зборнікі Брусава «Рускія сімвалісты» і яго першыя кнігі вершаў знаёмілі рускую публіку з «узорамі ўсіх форм «новай паэзіі»: свабодным вершам, слоўнай інструментоўкай, парнаскай чоткасцю, наўмысным зацямненнем сэнса ў духу Маларме, хлапецкай развязнасцю Рэмбо...» (Брусаў—«Аўтабіяграфія»). У гэтых вершах Брусава было шмат маладога задору і бунтарства, яны ўспрымаліся як выклік літаратурнай руціне і зрабіліся на многія годы прадметам цкавання жоўтай сувОрынскай прэсы. Разам з тым у вершах Брусава 90-х гадоў намячаюцца характэрныя для яго з часам філасофскія, гістарычныя матывы («Львіца сярод руін», «3 каметы»), а таксама новыя для рускай паэзіі матывы буржуазнага горада («Падругі», «На бульвары» і інш.). Пры бліжэйшым разглядзе аказваецца, як гэта адзначыў яшчэ ў 90-х гадах Уладзімір Салаўёў, што нават у фармальных адносінах вершы маладога Брусава не ўкладваюцца поўнасцю ў рамкі дэкадэнцка-сімвалісцкага стылю і, напрыклад, яго вершы цыкла «Вандраванне» з зборніка «Гэта я» (1897) стаяць бліжэй да класічных вершаў Гейне, чым да так званай «Новай паэзіі».

Спелым, склаўшымся майстрам Брусаў праявіў сябе ў кнігах «Трэцяя варта» (1900) і «Гораду і свету» (1903) і асабліва ў «Вянку» (1906). Цікава адзначыць, што першым крытыкам, які з пахвалой адгукнуўся аб паэтычным дараванні і майстэрстве Брусава, быў Максім Горкі, які напісаў на «Трэцюю варту» газетную рэцэнзію. Хутка пасля гэтага Брусаў атрымаў усеагульнае прызнанне, як паэт.

Новыя жыццерадасныя матывы, навеяныя грамадскім уздымам у краіне, надалі асноўны тон гэтым кнігам Брусава.

У вершах аб горадзе, якія складалі значную частку вершаў Брусава пачатка 900-х гадоў, паэт адкрыў паэзію ў велізарных «будынках з сталі і шкла», у бляску «электрычнага месяца», у шалёнай мітусні экіпажаў, невычарпальных і ярасных людскіх патоках і ў шуме «вячэрняга прыліва» вуліц вялікага горада. З выключнай мастацкай сілай Брусаў перадаў біенне ліхаманкава-напружанага пульса гарадскога жыцця XX века. З вялікай мастацкаю сілаю гучаць яго вядомыя вершы 1902 года «Каменшчык» і «Ноч». Вылучаюцца таксама такія «гарадскія» вершы Брусава гэтага перыяда, як «Фабрычная», у якіх дасканала паказан дух пралетарскага фальклора і перададзены з вялікай цеплынёй інтымныя перажыванні фабрычных рабочых.

Смелым дэярзаннем і сілай прасякнуты вершы Брусава 900-х гадоў на гістарычныя тэмы, у якіх выступаюць, як быццам злепленыя з бронзы і мрамара грандыёзныя фігуры герояў мінулага. У гэтых фігурах, адноўленых з незвычайнай стараннасцю паэтам-эрудытам, няма нічога музейнага, «археалагічнага» — яны авеяны духам сучаснасці і выклікаюць глыбокія мыслі. Такі, напрыклад, вобраз п'янага ад славы Напалеона — пераможцы адвечных грамад, цяжкая хада якога стала не пад сілу зямлі і яна развеяла яго славу («Напалеон»). Такі, напрыклад, вобраз брусаўскага Дон-Жуана — «дзёрзкага вандроўніка ў неаглядным моры», выкрываючага да дна ў вялікім пачуцці кахання сваю праясненую душу («Дон-Жуан»).

Да «гістарычных» вершаў прымыкае любоўная лірыка Брусава, асабліва яго эратычныя балады са зборніка «Гораду і свету». У любоўнай лірыцы Брусава, усхваляючай магутную страсць, манией і ярчэй за ўсё сказаўся ўплыў дэкадэнцтва і філасофіі суб'ектыўнага ідэалізма. Аднак у паказ любоўнай страсці Брусаў унёс шмат чаруючай нас і цяпер у гэтых яго вершах гармоніі і глыбіні мыслі.

У зборніку 1906 года «Вянок» Брусаў выступіў упершыню з вершамі на палітычныя тэмы. Брусаў, які яшчэ ў 1903 годзе марыў пакарыць рускаму імперыялізму Ціхі акіян («Ціхі акіян»), пад уплывам паражэння царскага ўрада ў вайне з Японіяй, а таксама пад уплывам магутнага рэвалюцыйнага ўздыму 1904—1905 гг., праслаўляе «акіян народнай страсці, які ў шчэпкі разбівае кволы трон». У неаднаразовых закліках Брусава гэтага перыяда «крушыць устоі вякаў», у яго «прывітальным гімне» «будучым гунам» было шмат ад беспадстаўнага буржуазнага максімалізма, але ў гэтых заклікаючых вершах знайшоў таксама сваё адлюстраванне разлад паэта з буржуазнай Расіяй. Са зголніцкай, баязлівай кадэцкай буржуазіяй Брусаву было яўна не па дарозе, і ён з вялікім палымнеючым пачуццём заклеймаў яе ў вядомым вершы «Здаволеным». Адсюль імкненне Брусава таго часу ў будучае:

> Свершатся сроки: загорится век,
> Чей луч блестит на быстрине столетий,
> И твердо станет вольный человек
> Пред ликом неба на своей планете.

Вершы Брусава пачатку 900-х гадоў з'явіліся мастацкім адкрэвеннем для многіх сучасных яму паэтаў. Не толькі матывы яго паэзіі, але і новыя рытмы кованых вершаў Брусава, у прыватнасці «свабодны верш», рыфмы Брусава, яго арыгінальныя, густыя і сакавітыя метафарычныя вобразы сталі моцным здабыткам рускай і беларускай паэзіі, будучы ўспрынятыя паэтамі розных напрамкаў: Блокам, Белым, Маякоўскім, Максімам Багдановічам і інш. Паступова перамагаючы імпрэсіянізм сваіх ранніх вершаў, Брусаў становіцца майстрам пластычнага красачнага вобраза, не маючым сабе, магчыма, роўнага ў рускай паэзіі (цыклы «Сайма», «На моры» і інш). Аднак у большасці сваіх вершаў 900-х гадоў ён імкнецца не да багацця фарбаў, а да падбору такіх слоўных азначэнняў, якія-б з найбольшай сціслаcцю, рэзкасцю і напружанасцю выражалі адпаведныя перажыванні ці карціны. Так, напрыклад, у апісанні казачнага палацу Брусаў, пазбягаючы якіх-небудзь красачных азначэнняў, перадае яркі блеск і раскошнае ўбранства залаў палаца двума скупымі радкамі:

> В блестящих залах из коралла
> Где жемчугов сверкает ряд.

У гэтым мастацтве шліфоўкі слова Брусаў наблізіўся да дасканаласці. У каго, напрыклад, з яго папярэднікаў у рускай паэзіі за выключэннем Пушкіна мы сустрэнем такія чоткія, выразныя і разам з тым поўныя грацыі і музычнай гармоніі вершы:

> Сосны, сонно онемелые.
> В бледном небе встали четко,
> И над ними тени белые
> Молча гаснут, тонут кротко.

У эпоху рэакцыі, наступіўшай пасля паражэння рэвалюцыі 1905 года, Брусаў выкрыў усю няўстойлівасць сваіх ранейшых палітычных ідэалаў.

Хаця паэт не бачыў і не разумеў шляхоў рэвалюцыйнай барацьбы, але ён усё-ж далёка не поўнасцю паддаўся настроям, ахапіўшым рускую буржуазна-дваранскую літаратуру пасля 1905 года і ў радзе сваіх твораў праслаўляў стойкую і ўпартую рэвалюцыйную барацьбу з аледзяніўшай рускае жыццё рэакцыяй.

> Пусть ветры вновь оледенили
> Разбег апрельских бурных рек,
> Их жизнь во временной могиле,
> Мы смеем верить скрытой силе,
> Ждать мая, мая в этот век.

Бязмежнай верай Брусава ў творчы геній чалавека былі народжаны выдатныя яго вершы гэтага перыяда аб вялікай перамозе чалавека над прыродай («Хвала чалавеку», «Фінскаму народу»), аб непераможным жыцці, зззяючым і грахочучым усюды («Вясёлы зоў», «Жыццё»), аб дзярзанні і магутнасці чалавечага генія («Першым авіятарам», «Дэдал і Ікар»), аб радасным пачуцці кахання («Вясновая песня дзяўчат», «Раздумы дзяўчыны»), аб невычарпальнай жыццёвасці вечна прыгожай прыроды («У полі», «На мяжы» і інш.). Жыццёсцвярджаючыя матывы асабліва характэрны для перадрэвалюцыйных вершаў Брусава 1915—17 гадоў, праўда, у цэлым радзе гэтых вершаў любоў да жыцця выражана ў вельмі развважальнай і нарачыта кніжнай форме.

Вылучаюцца вершы Брусава, прысвечаныя вайне 1914 года. Сустрэўшы вайну, як прадвесне новай культурнай эпохі, Брусаў хутка расчараваўся ў імперыялістычнай бойні і ў вершы «Трыццаты месяц», надрукаваным у пачатку 1917 года ў антываенным журнале «Летопись», страсна заклеймаў падпальшчыкаў гэтай бойні народаў. Такім чынам імперыялістычная вайна спрыяла праясненню палітычнай свядомасці Брусава і падрыхтавала Брусава да прыняцця Вялікай Кастрычніцкай соцыялістычнай рэвалюцыі.

Брусаў, які раней быў цесна звязан з сімвалізмам сваёй мастацкай манерай, пачынае цяпер адыходзіць ад пазіцый эстэтычнага індывідуалізма, адмаўляючыся ад выражэння цьмяных, няясных настрояў і цягнецца к вольным ад усякай сімволікі, важкім і адчувальным вобразам, багатым рэалістычнымі дэталямі. Характэрны ў гэтых адносінах, напрыклад, вершы зборніка «Люстра ценяў» (1912).

У Вялікай соцыялістычнай рэвалюцыі Брусаў знайшоў увасабленне сваіх заветных летуценняў аб лепшым будучым чалавецтва. Настаўнік рускай дарэвалюцыйнай паэзіі, «кароль паэтаў», як яго назваў адзін буржуазны крытык, Брусаў уступае хутка пасля рэвалюцыйнага перавароту ў рады комуністычнай партыі і становіцца канчаткова на шлях перагляду сваіх старых ідэйна-мастацкіх пазіцый. У буднях рэвалюцыі і грамадзянскай вайны у «трэцюю восень» галоднага 1920 года ён пазнаў вялікае творчае значэнне рэвалюцыі. Таму такой велічнай сілай абурэння прасякнут яго верш «Таварышам інтэлігентам», які выкрывае здрадніцтва часткі буржуазнай інтэлігенцыі. Таму пафас культуры і прагрэса, характэрны наогул для Брусава, знайшоў найбольш яркае выражэнне ў яго паслякастрычніцкіх вершах.

На шляху рэвалюцыйнай перабудовы Брусаву ўдалося зрабіць толькі першыя крокі і яго вершы аб рэвалюцыі нясуць яшчэ значны груз ідэалістычнага светапогляду і буржуазнага эстэтызма. Але шлях, на які стаў Брусаў пасля Кастрычніцкай рэвалюцыі, вёў яго к вялікаму мастацтву соцыялізма.

Вялікім творчым натхненнем прасякнуты так званыя «навуковыя» вершы Брусава, над якімі ён працаваў у апошнія годы свайго жыцця і якімі даказаў, што такія тэмы, як тэорыя адноснасці Эйнштэйна ці «свет электронаў», «свет эн-ных вымярэнняў» могуць зрабіцца здабыткам паэзіі. Аб вялікім творчым уздыме Брусава ў апошнія годы яго жыцця сведчыць таксама яго праца над выдатным зборнікам «Сны чалавецтва», які ў незакончаным выглядзе быў апублікаван пасля смерці паэта. «Сны чалавецтва»—гэты велізарны па замыслу твор, які ўключае ў сябе каля 3000 вершаў у духу паэзіі самых розных эпох і народаў: Аўстраліі, Грэнландыі, Індакітая, Егіпта, Карфагена, Германіі, Персіі, Кітая, Францыі, Японіі і інш.

Творчая дзейнасць Валерыя Брусава не абмяжоўваецца паэзіяй. Ён з'яўляецца аўтарам гістарычных раманаў і фантастычных навел і п'ес. Яму належаць навуковыя працы па гісторыі старажытнага ўсходу, шматлікія даследчыя артыкулы па гісторыі сусветнай і рускай літаратуры і высокамастацкія пераклады паэтаў розных эпох і народаў: Віргілія, Гётэ, Расіна, старажытных французскіх паэтаў, паэтаў Арменіі, Верлена, Верхарна, Анры дэ Рэнье, Янкі Купалы і многіх, многіх іншых. Выключна плённай была таксама дзейнасць Брусава-рэдактара, журналіста і прафесара-педагога. І ўсюды Брусаў уносіў дух наватарства і высокае майстэрства.

Нам. адказнага рэдактара Я. ГЕРЦОВІЧ.

Мінск, друкарня «Звязды». Адрас рэдакцыі газеты: Мінск, Совецкая, 76, Дом пісьменніка. Тэлефон 25-394. Газета «Літаратура і Мастацтва» выходзіць адзін раз у дэкаду. Уп. Галоўлітбела № Р—2018.